ЧАЦЬВЕРТЫ ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ І САМАПРАВЕРКІ

Пролетары ўсіх краёў, эднайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 197 (4102)
ЧАЦЬВЕР, 23 ЛІПЕНЯ
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

Пляны ўборачнай неадкладна давесьці да кожнага калгасьніка

Максымальна скараціць тэрміны ўборкі. Арганізаваць калектыўную ўборку неабагуленых пасеваў. Накіраваць свабодную рабочую сілу калгасаў на дапамогу саўгасам. Разгрузіць склады райкаапсаюзаў і неадкладна скончыць рамонт уборачных с.-г. машын

Нанесьці руйнуючы ўдар па кулацкай „падворнай“ і „кароўнай“ сыстэме разьмеркаваньня кармоў, якая мае на мэце сарваць стварэньне кармавой базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі

Скаціну ПАСЬВІЦЬ, раздачу кармоў СПЫНІЦЬ да складаньня фуражных балянсаў

Менск, 23 ліпеня

Прынцып «хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае» зьяўляецца асновай гаспадарчага замацаваньня калгасаў, дапойшага ўздыму калгаснага руху. Ажыцьцяўленьне пастаноў VI зьезду саветаў, правільнае разьмеркаваньне даходаў у калгасах зьяўляецца асноўным вагаром, які дасьць магчымасьць поўнасьцю і ў тэрмін убраць ураджай з калгасных палёў.

Ужо прайшло 13 дзён з таго часу, як апублікавана пастанова НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў. Задачай усіх раённых арганізацый было — неадкладна давесьці гэту пастанову да кожнага калгасу і калгасьніка, дабіцца поўнай ліквідацыі ўраўнілаўкі і змагацца за максымальна скарочаныя тэрміны ўборкі.

Між тым, у радзе раёнаў гэта найважнейшая пастанова апартуністычна недаацэньваецца. Калгасная маса аб ёй НЯ ВЕДАЕ, тады як пытаньне разьмеркаваньня даходаў з пачаткам уборкі становіцца надзвычай актуальным. Лепшым доказам таго, што рад раёнаў нідбайна аднёсься да папулярызацыі пастановы, зьлуляецца ход сенаўборкі. Рад раёнаў і калгасаў ужо скончылі ўборку сена і прыступілі да разьмеркаваньня яго сярод калгасьнікаў.

У процівагу ясным дырэктывам партыі і ўраду аб тым, што кармы павінны разьмяркоўвацца ТОЛЬКІ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З КОЛЬКАСЬЦЮ ВЫПРАЦАВАНЫХ ПРАЦАДЗЁН кожным калгасьнікам, у КОЙДАНАЎСКІМ, ЛЯДНЯНСКІМ і ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКІМ раёнах некаторыя калгасы пачалі раздачу сена па сутнасьці па кулацкаму «падворнаму» і «пакароўнаму» прынцыпу ў працівагу існуючым дырэктывам, сена пачалі раздаваць НЯ СКЛАЎШЫ КАРМАВЫХ БАЛЯНСАЎ, не задумаўшыся аб ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ КАРМАМІ АБАГУЛЕНАГА СТАДА, не паклапаціўшыся аб выкананьні ўзятых на сябе перад дзяржавай абавязкаў па КАНТРАКТАЦЫЙНЫХ дагаворах. Складаньне БРАНІЯВАНЫХ І ЗАПАСНЫХ ФОНДАЎ таксама выпушчана з парадку дня.

Што гэта, як ня простая дапамога кулаку, як ня яўная пагроза стварэньню кармавой базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі? Замест ажыцьцяўленьня прынцыпу «хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае» — у наяўнасьці факт кулацкай ураўнілаўкі. Замест таго, каб кармы эканоміць, а скаціну харчаваць на пасьбішчах — сена барбарскі разбазарваецца.

«Падворны» і «пакароўны» прынцып разьмеркаваньня сена зьніжае прадукцыйнасьць працы, не дае упэўненасьці добрасумленнай частцы калгасьнікаў, што і астатні ўраджай ня будзе разьмяркоўвацца па прынцыпу кулацкай ураўнілаўкі.

Гэтыя факты яскрава гавораць, што кіраўнікі раду калгасаў пашлі на кулацкай сьцежцы, якая вядзе да развалу і падрыву эканамічнай моцы калгасаў, стварае для гультаёў і прагульшчыкаў глебу пажыць за рахунак чужой працы. Гэта паказвае, што рад калгасаў на першым этапе ўборачнай — сенаўборкі — ня вытрымалі экзамэну, страцілі клясавую пільнасьць.

Гэтыя факты павінны зьявіцца самай сур'ёзнай перасьцярогай для ўсіх іншых раёнаў і калгасаў. Задача раённых арганізацый — даць рашучы адпор кулаку, які імкнецца прапагандай ураўнілаўкі расстроіць калгасныя рады і сарваць сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Трэба неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі і прыцягнуць да суровай адказнасьці апартуністаў і падкулачнікаў, якія выконваюць заказ клясавага ворага. Трэба рашуча чысьціць калгасныя рады ад кулацкіх элемэнтаў.

Там, дзе ня складзены кармавыя балясы, абагуленая жывёла на забясьпечана кармамі, ня вылучана частка сена для здачы па кантрактацыйных дагаворах, дзе ня створаны браніяваныя і запасныя фонды, — раённыя арганізацыі і калгасы павінны ЗАРАЗ-ЖА СПЫНІЦЬ РАЗДАЧУ КАРМОЎ. Выдачу авансаў сена, можна пачаць толькі тады, калі ўсе паказаныя пункты будуць ВЫКАНАНЫ, строга прытрымліваючыся пры выдачы авансаў колькасьці выпрацаваных кожным калгасьнікам працадзён, выдаючы авансы толькі калгасьнікам тым, якія выконваюць сваё вытворчае заданьне.

Усе кармавыя рэсурсы павінны быць узятыя на вучот, выдатканьні іх у летнія месяцы дапусьцімы толькі ў самых неабходных выпадках. Трэба весьці дакладны ўлік усяго ўраджаю выпрацоўкі кожнага калгасьніка, ЗАРАЗ ЖА АБГАВАРЫЦЬ І ДАВЕСЬЦІ ДА КОЖНАГА КАЛГАСЬНІКА АПОШНЮЮ ПАСТАНОВУ НКЗ І КАЛГАСЦЭНТРУ СССР АБ ПРЫКЛАДНЫМ РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ ДАХОДАЎ, растлумачыць тым калгасьнікам, якія ня маюць кароў, што яны могуць набыць жывёлу і атрымаць кармы з запаснога фонду або належную ім частку замест кармоў атрымаць грашыма ў выпадку працадзён.

Вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы патрабуе падвядзеньня пад яе моцнай кармавой базы.

Шырока разгорнуты калгасны рух і механізацыя сельскай гаспадаркі стваряюць усе неабходныя ўмовы для пасьпяховага вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі.

На шляху ажыцьцяўленьня гэтай праблемы кулак і яго памочнік — апартуніст, імкнуцца пашкодзіць. Найбольш «сезонным» вучасткам для работы кулака ў сучасны момант зьяўляецца разьмеркаваньне даходу ў калгасах. Працягваньнем ураўнілаўкі ён імкнецца сарваць уборку другога бальшавіцкага ўраджаю і стварэньне кармавой базы.

Задача раённых арганізацый, праўленьняў калгасаў, калгасьнікаў і ўсяе вёскі — правесьці грамадзянскі — пралетарскі — максымум пільнасьці за мэнэўрамі кулака і па малейшых спробах яго — каносіць руйнуючы ўдар.

Безагаворачна выканаць дырэктыву VI Усесаюзнага зьезду саветаў аб тым, што: «разьмеркаваньне калгасных даходаў па прынцыпу — хто больш і хто лепш працуе, той больш і атрымлівае, хто не працуе, той нічога не атрымоўвае — павінна стаць правілам для ўсіх калгасьнікаў і калгасаў».

Раёны ўключаюцца ў месячнік генэральнай праверкі

ПЯТРЫКОЎ. (Па тэлеграфу). Створан райштаб, мабілізавана 75 раённых работнікаў і паслана ў сельсаветы.

Райштаб — НОВІКАЎ.

***

СТАРЫЯ-ДАРОГІ. (Па тэлеграфу). Праца па правядзеньні месячніка распачата. Складзен райштаб, накіраваны 23 адказныя работнікі ў сельсаветы.

РАЙШТАБ.

***

ВУЗДА. (Па тэлеграфу). Вузьдзенскі раён уключыўся ў месячнік праверкі. Праведзена нарада партактыву і 20 чалавек накіраваны ў 13 сельсаветаў. Даны паказаньні ячэйкам і сельсаветам аб правядзеньні месячніка і арганізацыі ў калгасах і саўгасах самаправерачных брыгад.

РАЙШТАБ.

***

ЖЫТКАВІЧЫ. Жыткавіцкі раён уключыўся ў месячнік генэральнай праверкі падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю. Арганізован райштаб. У кожны сельсавет пасланы прадстаўнікі для арганізацыі дазорных пастоў у калгасах і пры сельсавеце. Райштаб робіць дапамогу адстаючым ва ўборцы як праз сельсаветы, так і непасрэдна.

***

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Па тэлеграфу). Мсьціслаўскі раён уключыўся ў месячнік генэральнай праверкі. Арганізован райштаб з 7 асоб, мабілізавана 40 чалавек гарпартактыву, якія накіраваны ў вёску. Прымацаваны адказныя таварышы да кожнага сельсавету на ўвесь час уборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы. Прыступлена да складаньня самаправерачных і буксірных брыгад.

Райштаб РАМАНЕНКА.

***

РАГАЧОЎ. (Па тэлеграфу). Рагачоўскі раён 20 ліпеня ўключыўся ў месячнік праверкі ходу ўборачнай кампаніі. Арганізован райштаб, выпрацаваны праграмы, праз раённую газэту даны ўказаньні ўсяму раёну. Мабілізаваны работнікі партыйных, савецкіх і прафсэкавых установаў і пасланы ў сельсаветы.

РАЙШТАБ.

***

ЗАСЛАЎЕ. (Па тэлефону). Заслаўскі раён уключыўся ў месячнік генэральнай праверкі. Створан райштаб, распрацаваны пляны. У калгасах і саўгасах складаюцца самаправерачныя брыгады. Сёньня выяжджае раённы актыў у сельсаветы.

Даць рабочую сілу саўгасам
У Слуцку не заключаны дагавары на адыход калгасьнікаў у саўгасы

СЛУЦАК.

Праведзены рэйд-праверка падрыхтоўкі раённых установаў да ўборкі ўраджаю паказаў, што райарганізацыі амаль нічога не зрабілі, каб забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне ўборкі. Паводле дырэктыў 15 ліпеня павінна быць скончана сенаўборка. Між тым, па Слуцкім раёне плян сенаўборкі выкананы на 70 проц. Асабліва злачынна праходзіць уборка сена на індывідуальным сэктары, які выпаў з-пад увагі райарганізацый і ў выніку плян выкананы на 50 проц.

Адстаюць таксама і калгасы. Звыш 20 калгасаў раёну яшчэ не разгарнулі як належыць сенаўборку. Адсутнічае апэрацыйнае кіраўніцтва з боку райкалгасаюзу, які ня прыняў належных мер па ўкараненьні зьдзельшчыны ў калгасах і нават ня ведае, колькі калгасаў пераведзена на зьдзельшчыну.

Адчуваецца вялікі недахват рабочай сілы ў саўгасах. Між тым, з калгасамі не заключаны дагавары на адыход рабочай сілы ў саўгасы. У саўгасе Бранчыцы адчуваецца вялікі недахват рабочай сілы, а ў суседнім калгасе ёсьць звыш 30 проц. лішняй рабочай сілы.

Ня лепшая справа і ў МТС. Уборачныя машыны не адрамантаваны, а 12 трактараў патрабуюць сур'ёзнага рамонту.

Брыгада «Зьвязды», «Калгасьніка Беларусі» і «Ленінская шляхта»:
Аркус, Я. Шкадарэвіч, Бугроў.

Перавыкананьнем норм змагаюцца за скарочаныя тэрміны ўборкі
Калгас „Чырвоная Іскра“ выклікае на спаборніцтва калгасы імя Леніна і „Новае жыцьцё“

ПУХАВІЧЫ, 21. Калгасьнікі калгасу «ЧЫРВОНАЯ ІСКРА», абгаворваючы задачы, пастаўленыя партыяй на пэрыяд уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, абвясьцілі сябе ўдарнікамі і выклікалі на сацспаборніцтва калгасы імя ЛЕНІНА і «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ» ў найхутчэйшым ажыцьцяўленьні тэрмінаў уборкі і асеньняй сяўбы.

На пэрыяд уборачнай створан ударны рабселькораўскі пост, які па-баявому змагаецца ЗА СКАРАЧЭНЬНЕ ТЭРМІНАЎ УБОРКІ. Ударная брыгада касцоў-селькораў замест плянавай нормы 0,35 гэкт. на аднаго касца выконвае па 0,45 гэкт. Усе касцы разьбіты на 10 брыгад, паміж якімі шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Правільная расстаноўка сіл і арганізацыя працы ў калгасе выклікалі новы прыпіў адноасобнікаў. За апошнія два дні ў калгас улілося 20 гаспадарак адноасобнікаў, якія зараз-жа пераходзяць на сацыялістычныя мэтады працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Брыгада «Зьвязды»
БУДЗІНАЎ МАКАРЭВІЧ.

Скончылі сенаўборку, прыступілі да жніва
Уборку азімых праводзім калектыўна

КАПЫЛЬ. Калгас «Зара свабоды» скончыў уборку сена 18 ліпеня. Убрана 250 гэкт. сенажаці. Апрача гэтага ўбрана 25 гэкт. сенажаці адноасобнікаў, якія адмовіліся касіць. Уся праца праводзілася на аснове зьдзельшчыны і шырокага разгортваньня сацспаборніцтва паміж брыгадамі. Вось лепшая ўдарная брыгада па касьбе, якая замест 3,35 гэкт. у дзень скошвала 5 гэкт.: ГУРЫНОВІЧ А., АСТРЭЙКА П., ДЛУГАШЭЎСКІ А., АСТРЭЙКА Т., РАТЫНСКІ Я., КАНДЫБОВІЧ У., САЛАНОВІЧ У.

Ударная брыгада жанчын па грэблёве — КЛЮЙКО Н., ГУРЫНОВІЧ А., САЛАНОВІЧ А., МІКАЛАЕЎСКАЯ А., ЗАХАРЧЫК З., ЖЫБУЛЯ А., ДУБОВІК В.—дзённае заданьне ў 3,5 гэкт. перавыконвала і ў сярэднім выпрацоўвала 5,5 гэкт.

Калгас дапамог 102 працаднямі саўгасу «Рымо».

17 ліпеня калгас першым у раёне прыступіў да ўборкі жыта. Новыя калгасьнікі пастанавілі аграмадзіць азімыя пасевы і праводзіць уборку калектыўна.

А. КЛЮЙКО.

ПАКАЗАНЬНІ тав. СТАЛІНА—
у аснову далейшай работы

САЎГАС БАНОНЬ, 18-VII.

Абгаданы сход партыйнага і камсамольскага калектыву саўгасу абгаварыў прамову тав. Сталіна.

«Гэта прамова, — заявілі партыйцы і камсамольцы на сваім сходзе — высоўвае рад адказьнейшых палітычна-гаспадарчых задач, якія павінны быць пакладзены ў аснову далейшай работы саўгасу.

Адміністрацыі саўгасу даручана заключыць дагаворы на вярбоўку рабочай сілы з калгасамі Літвінаўскага, Шпакоўчынскага і Астроўшчынскага сельсавету суцэльнай калектывізацыі.

Да гэтага часу ў асобных галінах гаспадаркі існавала ўраўнілаўка ў зарплаце. Напрыклад, старэйшы рабочы аддзяленьня атрымліваў 53 рублі, тады, як палявы рабочы, яму падначаленны, атрымліваў звыш 75-80 рублёў. У бліжэйшыя-ж дні адміністрацыя саўгасу павінна перагледзець нормы аплаты і скасаваць ураўнілаўку ў зарплаце.

Сход высунуў перад адміністрацыяй саўгасу пытаньне аб канчатковай ліквідацыі абязьлічкі па ўсіх галінах работ і прымацаваньні поўных коняй і збруі да поўных палявых рабочых і поўных сьвінарак да сьвіней. Да кастрычніка ў саўгасе павінны быць поўнасьцю пераведзены на гаспадарчы разрахунак усе аддзяленьні і цэхі. З пачатка жніўня пачнецца перавод на гаспадарчы разрахунак сьвінагадоўчага цэху.

Прамова тав. Сталіна гэтымі днямі будзе абмеркавана таксама на зьлёце ўдарнікаў саўгасу.

Выязная брыгада «Зьвязды»:
А. ЛІПНЁВЫ, К. КРАПІВА

Барацьба з апартуністамі--
Парука замацаваньня калгасу „Расьсьвет-пераможца„

ЖЛОБІН, 15. (БЕЛТА). Ня гледзячы на тое, што калгас «Расьсьвет пераможца» зьяўляецца самым буйным у раёне, арганізацыя працы ў ім не наладжана. Выдача кніжак і падлік працы праведзены фармальна, ні колькасьці, ні якасьці выкананай работы не паказваецца. Падрыхтоўчай работы да ўборкі не вядзецца. Да гэтага часу не адрамантаваны машыны, а снопавязалка зусім вышла са строю.

Безгаспадарчасьць і дрэнная арганізацыя працы зусім спынілі прыліў у калгас. Ячэйка КП(б)Б не павярнулася да гаспадарчай працы ў калгасе. Старшыня калгасу член партыі Пугачоў М. глумачыць так: «адзіноасобнікі ня ідуць у калгас таму, што трэба працаваць круглы год; у калгасе цяжка працаваць». Парт'ячэйка не рэагуе за падобныя выступленьні апартуністаў. У выніку такой «работы» старшыні і ячэйкі заможнік Бобрыкаў Нікіта ўвесь час агітуе супроць зьдзельшчыны і супроць вялікіх ўзоры працы. Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ніхто ня кіруе. Добрыя пачынаньні не падхапляюцца і не пераносяцца на ўсю працу ў калгасе. Перавышэньне норм выпрацоўкі асобнымі брыгадамі ўшчэнт разьбіваюць правамагчымасьці прыстасаваньня зьдзельшчыны ў буйных калгасах. Калгас «Расьсьвет-пераможца» мае ўсе падставы для таго, каб заняць першае месца ня толькі ў раёне, але і ў БССР. За плячамі ў яго ляжыць дзесяцігадовы вопыт калектыўнай працы. Рашучая барацьба з апартуністычнымі разважаньнямі і кулацкай агітацыяй—першая парука ў замацаваньні калгасу.

По прынцапе кулацкай ураўнілаўкі
ў Койданаве раздаюць сена

КОЙДАНАВА. Па ўсім Койданаўскім раёне сенаўборка па калгасах набліжаецца да канца. Разам з гэтым распачалася выдача авансу сена і канюшыны калгасьнікам, якія маюць неаграмаджаную жывёлу. Пастанова НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб разьмеркаваньні ўраджаю калгасамі абыходзіцца.

Большасьць калгасаў гэту пастанову не распрацавалі, у выніку кармы пачалі разьмяркоўвацца па прынцыпах кулацкай ураўнілаўкі. Сена раздаюць па 30-50-100 і больш пудоў на «штуку» ці на «двор» бяз усякага ўліку выпрацаваных кожным калгасьнікам працадзён.

Байдацкі сельсавет даў яўна кулацкую ўстаноўку—спачатку забясьпечыць кармамі жывёлу, якая знаходзіцца ў індывідуальным карыстаньні, а рэшту —для аграмаджанай. Калгас «Чырвоная зорка» гэтага-ж сельсавету ўжо выдаў кожнаму калгасьніку, які мае карову і іншую неаграмаджаную жывёлу, па 60 пудоў сена. Такое-ж становішча і ў калгас «Пяцігодка», Ляхавіцкаг сельсавету,—выдана па 50-60 пудоў.

У калгасе «Новае жыцьцё», Нарэйкаўскага сельсавету, сена выдана па 140 пудоў на кожны двор, вусім ня цікавячыся пытаньнем, ці хопіць кармоў для аграмаджанай калгаснай жывёлы. Гэтыя факты якраз супадаюць з тым, што ў кі раўніцтве калгасаў знаходзіцца заможнік Лямака, які зьяўляецца ініцыятарам кулацкай сыстэмы разьмеркаваньня кармоў.

Койданаўская МТС мае вялікія дасягненьні па пасеўнай кампаніі, і ў падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі, але ў сваім надпэфным калгасе «Новае жыцьцё» прагледзела і своячасова ня выкрыла кулацкай махінацыі ў разьмеркаваньні сена.

Ня лепшае становішча і ў калгасе «Зьвязда», Станькаўскага сельсавету. Сакратар парт'ячэйкі калгасу Вязьнь-Фаніпаль, які праводзіў сход калгасьнікаў аб разьмеркаваньні сена, апартуністычна аднёсься да гэтага пытаньня. У выніку калгасьнікі пастанавілі выдаць сена кожнаму па 100 пудоў, ня ўлічваючы колькасьці выпрацаваных калгасьнікам працадзён. Калгасьнік Вашкевіч самавольна захапіў для неаграмаджанага каня 75 пудоў канюшыны, а потым каня прадаў.

Ужо раздана сена кожнаму пароўні ад 20 да 60 пудоў у калгасах: «Чырвонае возера», «Узвышша», «Пралетарская свабода», Ляхаўскага сельсавету; «Ленінскі барэц», Балажэвіцкага сельсавету «Другая бальшавіцкая сяўба» і «Перамога», Макаўчынскага сельсавету; «Петрашэвічы», Старыкнякоўскага сельсавету; «Перамога 1», Расьсьвет 1», Вайдацкага сельсавету; «Перамога 2», «Вольная праца», Негарэльскага сельсавету; «Сталінскі прызыў», «Чырвоны пагранічнік», Путчынскага сельсавету; «Расьсьвет 3», Станькаўскага сельсавету, «Сьцяг камунізму» і імя Розы Люксэмбург, Дабрынеўскага сельсавету.

Толькі цяпер пачалі праводзіць масавую работу і распрадоўку пастановы Наркамзему і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні ўраджаю па калгасах. Раённыя арганізацыі павінны ўжыць рашучыя меры да выпраўленьня зробленых памылак і недапушчэньня далейшага разбазарваньня сена.

А. К.

Прыступаем да ўборкі ўраджаю бяз пляну

Праз тыдзень жніво.

Праз тыдзень армія калгасьнікаў рынецца на штурм ўраджаю. Але армія гэта амаль не пабудавана і пляну штурму няма. Ёсьць самацёк і «авось».

На пасяджэньні старшынь калгасаў Менскага раёну высьветлілася, што рабочыя пляны па ўборцы ўраджаю складзены ў 50 проц. калгасаў і на тым-жа пасяджэньні канстатавана, што і са складзеных больш паловы нікуды ня вартыя.

У гарза пасьля праверкі некаторых плянаў заяўляюць:

—Пляны ці павярхоўныя, ці зусім не рэальныя. Няправільны ўлік рабсілы і няправільная не расстаноўка. Няма частак для уборачных машын і майстроў для рамонту, затрымліваецца аборка складных машын у МТС.

І гарза, і райкалгасаюз, і МТС крычаць:

—Бяз пляну ня можа быць прадукцыйнага, тэрміновага і выразнага выкананьня работы. Мабілізуюць для складаньня плянаў агранамаў, настаўнікаў і бухгальтароў. Гарсавет прапанаваў для правядзеньня сельска-гаспадарчых ударных кампаній 70 навуковых работнікаў з досьледчых станцый і атрымаў вапэўненьне, што прапанова прымаецца і будзе выкананая. Сёй-той прабаваў выканаць, аднак, «выключная» аўдыторыя, відаць, хутка стаміла вучоных таварышоў —аб іх дапамозе калгасам справай у асаблівае вострую хвіліну нічога ня чуваць. Магчыма з пункту погляду пагыбленай навукі перавесьці поўнасьменных калгасьнікаў на зьдзельшчыну ці скласьці невялікі рабочы плян уборкі ўраджаю—дробязь. Але для будаўніцтва сацыялізму, асабліва для правядзеньня пяцігодкі ў гэрмін — гэта работа вялізарнейшай важнасьці.

Няхай т.т. навуковыя работнікі не забываюць, паколькі яны прапанову гарсавету прынялі, значыць яе трэба выконваць. Між тым сваімі бесстарожнымі адносінамі самі-ж яго зрываюць.

Таксама катэгарычна трэба адпачыць недаўпчальны антаганізм у рабоце паміж МТС і райкалгасаюзам.

—Кантакту ў рабоце ня было і няма. Адзін бок ня ведае, што рабіў другі. А таму скрозь і ўсюды вядзецца роўнадежная работа.

—Праз тыдзень жніво. Арганізавана і агульныя сілы трэба ліквідаваць прарыў на фронце плянаваньня ўборачнай кампаніі.

А. ОРШЫН

Аграмаджаная жывёла пачакае...

ЛЯДЫ. На агульным сходзе калгасу імя Дзяржынскага (нёска Баева) пад старшынствам Грышанава В. прынята пастанова аб разьмеркаваньні кармоў сярод калгасьнікаў, якая носьць яўна кулацкі характар. Сход парашыў выдаць кожнаму калгасьніку, які мае карову і авечкі, па 25 пудоў канюшыны на кожную карову, сена 40 пудоў, саломы 40 пудоў, адпаведную колькасьць мякіны і на кожную авечку па 20 пудоў сена. Гэта разьмеркаваньне пачалі рабіць, ня ўлічваючы патрэб аграмаджанай жывёлы. Праўленьне дапусьціла раздачу кармоў, ігнаруючы дырэктыву цэнтральных арганізацый аб тым, што разьмеркаваньне павінна праводзіцца ў адпаведнасьці з колькасьцю выпрацаваных працадзён кожным калгасьнікам.

У выніку грубога парушэньня пастановы Наркамзему і Калгасцэнтру СССР, значна ўпала працадзьцыпліна, асабліва сярод часткі калгасьнікаў, якія ня маюць кароў.

Мясцовая парт'ячэйка зусім не рэагуе на гэта антыкалгаснае дзеяньне праўленьня.

Ліп—ў.

Разьмеркаваньне па каровах, а не працаднёх

ЧЫРВОНАЯ-СЛАБАДА. У некаторых калгасах раёну да гэтага часу незразумелі разьмеркаваньня ўраджаю па прынцыпе «хто больш працуе, той больш і атрымлівае». У калгасе «Чырвоны баец» старшыня калгасу заяўляе:

— У нас для кожнай каровы будзе вызначана адна норма канюшыны і кожны яе атрымлівае.

А ў калгасе «Прагрэс» ад слоў перайшлі да справы. Праўленьне дазволіла кожнаму калгасьніку узяць з калгасных палёў па чатыры вазы канюшыны. Калгасьнікі, возячы канюшыну, сабе везьлі вазы па 30-40 пудоў, а ў аграмаджанае гумно—па 20-25 пудоў воз.

МІНСКІ.

Ход рамонту ўборачных сельска-гаспадарчых машын

Жніварак	—	47 проц.
Снопавязалак	—	46,5 проц.
Сенакасілак	—	59 проц.
Конных грабель	—	67,8 проц.
Складаных малатарань	—	2,9 проц.
Конных малатарань	—	48,1 проц.
Вазоў (калёсы)	—	80,9 проц.

0,45%

ПУХАВІЧЫ, 18-VII. Пухавіцкі раён—жывёлагадоўчы. Але пытаньням стварэньня кармавой базы ў раёне аддаецца вельмі мала ўвагі. Гэта можна бачыць з выпікаў ходу сіласаваньня. На сёньнішні дзень з 10.800 тон у раёне засіласавана ўсяго 46, што складае 0,45 пляну.

(БЕЛТА).



Калгасьнікі за рамонтам

Даць адпор апартуністам, якія скарацілі пляны сьвінагадоўлі

20 ліпеня на пасяджэньні калегіі Наркамзему, якое адбылося пад старшынствам нам. наркома т. Паніматка, былі заслуханы даклады загадчыкаў райземчастак Койданаўскага, Пухавіцкага, Жыткавіцкага і Заслаўскага раёнаў аб ходзе арганізацыі, камплектаваньні, будаўніцтва МТФ, СТФ і здачы таварнай прадукцыі дзяржаве калгасамі.

На пасяджэньні выявілася бязьдзейнасьць амаль усіх гэтых раёнаў у арганізацыі фэрм сала, мяса і малака і асабліва сьвінагадоўчага-таварных фэрм.

«Рэкорд» у адносінах як МТФ, так і СТФ узяў Пухавіцкі раён. Пухавіцкі раён правяў апартуністычныя адносіны да СТФ. Атрымаўшы заданьне НКЗ БССР арганізаваць 25 СТФ в колькасьцю 2.700 сьвіноматак, прозадыцым Пухавіцкага раёну адразу-ж скараціў і прыняў плян камплектаваньня толькі 2.203 шт. Скараціўшы плян, пухавіцкія апартуністы ахаладзелі і злачынна бязьдзейнічалі. Да гэтага часу афармлены толькі 8 СТФ і ўкамплектаваны на 27 проц., што ў адносінах да заданьня складае 33 проц.

Прадстаўнік Пухавіцкага раёну сам прызнаўся, што ў адносінах да сьвіньі яны праявілі «сьвінскія» адносіны.

Заслаўскі раён таксама бязьдзейнічаў і таму з 18 СТФ афармлена толькі 12 і ўкамплектаваны на 28 проц. сьвіноматкамі і на 40 проц. разам з маладняком. Койданаўскі раён укамплектаваў СТФ сьвіноматкамі разам з маладняком на 42 проц.

Неадказваньняючае становішча і з малочна-таварнымі фэрмамі.

Пухавіцкі раён укамплектаваў фэрмы толькі на 42 проц. Койданаўскі раён укамплектаваў на 89 проц., Заслаўскі раён—на 84 проц. і Жыткавіцкі—на 80 проц.

Будаўніцтва сьвінарнікаў і абор таксама яшчэ знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Раёны чакаюць цьвікоў.

Асабліва катастрафічнае становішча са здачай таварнай прадукцыі дзяржаве. Раёны праяўляюць бязадказныя адносіны да гэтай справы. Самацёку і спа жывецкім настроям, якія ёсьць у некаторых калгасах, не даецца адпору. Жыткавіцкі раён па здачы сьвіной таварнай прадукцыі выканаў плян на 0,5 проц., Заслаўскі — на 1,2 проц., Пухавіцкі — на 2,3 проц. і Койданаўскі—на 7 проц. У Заслаўскім раёне нават не заключаны дагаворы з калгасамі на здачу сьвінагадоўчай таварнай прадукцыі запрача 12 фэрм.

Ня лепшая справа і са здачай малочнай прадукцыі. Аб тым, што раёны гэтай справай не займаюцца, а калі і займаюцца, дык вельмі мала, сьведчыць той факт, што прадстаўнік Пухавіцкага раёну ня меў нават вестак аб ходзе здачы малака.

Арганізацыя, камплектаваньне і будаўніцтва МТФ і СТФ адбываецца такімі тэмпамі далей ня можа. Патрэбен крутэ пералом, які-б забясьпечыў выкананьне бальшога заданьня партыі і ўраду ў гэрмін.

Калегія НКЗ жорстка асудзіла і ўдарыла па апартуністычных адносінах раёна да гэтай важнейшай справы. У бліжэйшым часе на камісіі выкананьня пры СНК будзе заслухана справаздача аб рабоце Пухавіцкага жывёлагадоўчага раёну.

Раёнам прапанавана па прыкладзе перадавых раёнаў у арганізацыі МТФ і СТФ (Чэрыкаў, Плешчаніцы) паслаць брыгады на куплі сьвіньней і камплектаваньні МТФ і СТФ. У кожным райкалгасаюзе павінен быць спэцыяльны ўпаўнаважаны па арганізацыі фэрм.

І, нарэшце патрэбен рашучы зрух у здачы таварнай прадукцыі дзяржаве.

Б. Харытончык.

УРАДЖАЙ ПАТРАБУЕ

Праверка ходу падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі, праведзеная брыгадай Калгасцэнтру СССР, паказвае, што, ня гледзячы на своячасовыя дырэктывы партыі і ўраду, падрыхтоўчая работа да правядзеньня ўборкі ў большасьці калгасаў БССР да сучаснага моманту ня складзены. Складзеныя-ж пляны ў значнай частцы калгасаў носяць фармальны характар (складзены агранамамі без прыцягненьня пытрокіх калгасных мас).

Ёсьць выпадкі окажэньняў і скрыўленьняў у плянах, няўзгодкі з установамі Белкалгасцэнтру аб тэрмінах выкананьня. У плянах не адбіваецца неабходнасьць шпаргага выкананьня работ (Дрысенскі, Лёзьнянскі раёны). Брыгады па відах работ не расстаўлены.

ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА І УЛІК ПРАЦЫ

Зьдзельшчына ў калгасах БССР на 10 ліпеня ўведзена толькі ў 65,8 проц. калгасаў. Працоўныя кніжкі раздаены 32,1 проц. калгасьнікам. Запіс працадзён зроблен 1.630 калгасьнікам—18,5 проц. У радзе калгасаў, у якіх праводзілася абсьледваньне, запіс працадзён у працоўных кніжках робіцца ў гадзінах, бяз улику якасьці і колькасьці працы. Пераважае ўраўнілаўка пры налічэньні працадзён членам брыгады.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўжываецца слаба. Улику результатаў сацспаборніцтва няма. Фонды прэміраваньня па большасьці калгасаў, па якіх праводзіцца абсьледваньне, ня вылучаны. Наглядаюцца выпадкі нежаданьня з боку некаторых праўленьняў калгасаў налічваць калгасьнікам працадні за перавышэньне нормы.

Добрым паказальнікам у галіне зьдзельшчыны зьяўляецца большасьць калгасаў Гомельскага раёну, дзе працоўныя кніжкі раздаены поўнасьцю ўсім калгасьнікам і ўкаранена зьдзельшчына. Запіс працадзён ужо падыходзіць да канца. Трэба ўсё-ж адзначыць, што прафсэкцыяльныя арганізацыі ў гэтай рабоце ня прымалі ўдзелу.

КАДРЫ

Падрыхтоўка кадраў да ўборачнай кампаніі па сучасьці сарвана. Калгрольнае заданьне Калгасцэнтру СССР выканана на 56 проц., а Белкалгасцэнтру — на 19 проц.

У раёнах, якія абсьледаваліся, за выключэньнем Гомельскага, пытаньням падрыхтоўкі кадраў амаль не займаліся. Лёзьнянскі раён заданьне выканаў на 5 проц., Дрысенскі—на 8 проц. У радзе раёнаў курсы праведзены фармальна і належных вынікаў не далі. Скончыўшыя курсы скарыстоўваюцца на месцах не па прызначэньні.

Лепш справа стаіць у Гомельскім раёне, дзе заданьне па кадрах выканана поўнасьцю і курсанты скарыстоўваюцца па сваёй лініі.

Прысланым украінцам на калгасную работу ў некаторых раёнах не стварылі належных умоў. У выніку 11 чалавек вярнулася на Украіну з Жлобінскага, Каралінскага і Койданаўскага раёнаў. Намечаная Белкалгасцэнтрам кантрольная лічба па вылучэньні 1.039 інструктароў раёнам выканана на 8,2 проц., а ў раёнах дасьледваньня—0 проц.

Вылучэньне лепшых калгасьнікаў для пераняцьця іх вопыту ў другія калгасы Белкалгасцэнтрам не праведзена. Плян вылучэньня жанчын на кіруючую калгасную работу выканан на 19,3 проц.

ХОД ПРАПОЛАЧНАЙ КАМПАНІІ

Ход праполачнай кампаніі незадавальняючы, асабліва па тэхнічных культурах. Плян праполкі ільну па 57 раёнах выканан на 32,1 проц., праполкі гародаў па 58 раёнах—на 74,5 проц., акучваньня кораньплодаў—на 62,1 проц. Ёсьць некалькі раёнаў, дзе праполка зусім не вядзецца (Дрысенскі, Лёзьнянскі і Заслаўскі раёны).

СЕНАЎБОРАЧНАЯ І СІЛАСНАЯ КАМПАНІЯ

Сенаўборачная і сіласная кампанія—самы адсталы вучастак работы калгасаў. Плян уборкі натуральных сенажацяй па калгасах выканан на 33 проц., а на селных травах—на 91,6 проц. З прычыны зацяжкі ўборкі ў радзе раёнаў другі ўкос пастаўлен пад п

БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК—

калектыўны прапагандыст і арганізатар мас на барацьбу за сацыялізм

Буржуазная і сацыял-фашысцкая прэса—зброя контр-рэвалюцыі

З дакладу т. БУДЗІНСКАГА на 2-м Ўсебеларускім зьезьдзе рабсельваенкораў

Таварышы! Наш друк неадлучны ад нашай партыі. Пачынаючы з падпольнага перыяду, наш друк быў найбольш дзейсным сродкам уплыўнасьці камуністычнай партыі на масы, зброяй прапаганды камуністычных ідэй, зброяй арганізацыі мас. Наш друк ніколі не разглядаўся нашай партыяй выключна, як зброя прапаганды. Заўсёды бальшавікі разглядалі друк, падкрэсьліваю, сьвядома разглядалі друк, як фактар, які арганізуе масы, як тую частку партыйнага ўзбраеньня, якая дапамагае партыі згуртоўваць масы, прыводзіць іх у мэтазгодныя формы арганізацыі для барацьбы.

1. За ленінскае разуменьне ролі бальшавіцкага друку

У падыходзе да пытаньняў друку бальшавікі адрозьніваліся ад іншых рэвалюцыйных сацыял-дэмакратаў (напрыклад, СД КПП) тым, што ў той час, калі рэвалюцыйныя сацыял-дэмакраты недаацэньвалі або не заўважалі значэньня друку, як арганізуючага фактара, разглядалі друк выключна, як зброю прапаганды, як зброю агітацыі, бальшавікі з першага моманту свайго існаваньня клалі націск у роўнай ступені і на арганізатарскую ролю друку. Ленін у 1901 г. у артыкуле «С чего начать»? такім чынам акрэсьліваў ролю і характар нашага партыйнага друку:

> **«Роля газэты не абмяжоўваецца, аднак, адным распаўсюджаньнем ідэй, адным палітычным выхаваньнем і прыцягненьнем палітычных саюзьнікаў. Газэта—ня толькі калектыўны прапагандыст і калектыўны агітатар, але таксама і калектыўны арганізатар... Пры дапамозе газэты і ў сувязі з ёю сама сабой будзе складвацца пастаянная арганізацыя... Адна ўжо тэхнічная задача—нападзіць правільнае забесьпячэньне газэты матар'яламі і правільнае распаўсюджаньне яе—прымушае стварыць сетку мясцовых агентаў адзінай партыі, агентаў, якія знаходзяцца ў жывых зносінах адзін з другім, ведаюць агульнае палажэньне спраў, прывыкаюць рэгулярна выконваць раздробленыя функцыі агульна-рускай работы, прабуюць свае сілы на арганізацыі тых ці іншых рэвалюцыйных дзеяньняў» (том IV, стар. 35-39).**

Гэта акрэсьленьне характару нашага друку, данае Леніным, ня страціла свайго значэньня і сёньня. Апартуністам зьяўляецца той, хто лічыць, што работнік друку—я гэта разуменьне ўжываю ў самым шырокім значэньні гэтага слова, значыцца, гавару ня толькі аб прафесыянальных работніках друку, але аб усёй рабселькораўскай масе,—што работнікі друку выключна агітатары, выключна прапагандысты, выключна сымпалізатары або выключна крытыкі і выкрывальнікі. На гэтым пункце гледжаньня стаяць правыя апартуністы, на чале якіх стаяў у свой час і тав. **БУХАРЫН.** Вядома, гэта ацэнка ролі друку і работнікаў друку **нічога супольнага ня мае з сапраўднасьцю і з устаноўкамі нашай партыі.**

Ленін у артыкуле «Письмо к товарищу о газете «Вперед» наступным чынам вызначае мэтады стварэньня пралетарскага друку:

> **«Гэта недарэчнасьць, быццам-бы іменна літаратары і толькі літаратары (у прафэсыянальным сэнсе гэтага слова) здольны з посьпехам прымаць удзел у органе; наадварот, орган будзе жывым і жыцьцёвым толькі тады, калі на пяць кіруючых і пастаянна пішучых літаратараў прыпадзе пяцьсот і пяць тысяч работнікаў нелітаратараў» (том V, стар. 506).**

У гэтай фармулёўцы Леніна завершана ўся праграма разгортваньня рабселькораўскага руху, як асноўнай рухаючай сілы нашага бальшавіцкага друку.

Наш бальшавіцкі друк заўсёды быў друкам **рабочае клясы** і для рабочае клясы. У стары час, у час нашага падпольля, ды і **зараз** яшчэ у краінах капіталу ёсьць падавучай многа друкаваных органаў буржуазіі і дробнай буржуазіі, якія прызначаны для рабочае клясы, якія **падрабляюць** пад мову рабочае клясы, прабуюць стварыць уражаньне, што яны стаяць на абароне рабочае клясы. Аднак, гэтыя органы друку, як-бы яны шумна не называліся ці то **«Прыяцель народу»**, ці то **«Роботнік»**, ці то **«Гонец волі»**—усе служаць адной мэце: яны імкнуцца паралізаваць барацьбу рабочае клясы, адцягнуць яе ад рэвалюцыйных дзеяньняў, эрабіць яе такім чынам навольнікам капіталу. Гэты друк «для рабочага» зьяўляецца друкам найбольш варожым **рабочай клясе**, бо ён на справе служыць інтарэсам, варожым рабочай клясе.

Бальшавікі, ня ў прыклад меншавікам, ня ў прыклад эгодніцкім партыям, заўсёды лічылі, што друк неазмен быць партыйным, клясавым. Таму наш друк заўсёды быў друкам ня толькі для рабочае клясы, але і друкам, які стараўся рабочай клясай. Бальшавікі патрабавалі, каб кожны орган друку меў выразна акрэсьленыя задачы, выразна акрэсьленыя мэты, мэтады свайёй работы і палітычную лінію. Яны самым рашучым чынам змагаліся за раскрыцьцё істотнага твару органаў друку, за выкрыцьцё клясавай сутнасьці тых органаў друку, якія сваю варожасьць да рабочай клясы ўтойвалі пад маскай паза клясавасьці, надпартыйнасьці, аб'ектывізму.

2. Твар буржуазнай „свабоды слова“

Свабода слова. Неабходна крыху спынуцца на нашым рабселькораўскім зьезьдзе на гэтай «свабодзе слова». Свабоду слова кожны па-свойму разумее. Усё залежыць ад таго, да якой клясы прыналежыць той, хто гаворыць аб свабодзе слова, у залежнасьці ад таго, інтарэсам якой клясы павінна служыць гэта свабода слова. Для фашыста свабода слова азначае разуменьне рабочае клясы буржуазнай хлусьнёю аб нацыянальным адзінстве, аб клясавай салідарнасьці або аб зьверствах бальшавікоў. Фашыст спакойна закрывае ўдарам гумовай палкі рот камуністу за тое, што гэты апошні выкрывае фашысцкае прыгнечаньне і капіталістычную эксплёатацыю. Вазьмеце нашых унутраных ворагаў. Для многіх з вас прозьвішча літаратурнага крытыка **Ляннёва** ня чужое. Дык вось гэты літаратурны крытык, якога можна было чытаць у нашых тоўстых часопісях, неяк выказаў наступную думку: **«Дайце нам**—т. зн. буржуазнай зьменавехаўскай інтэлігенцыі, **свабодна выказвацца ў савецкай прэсе ў сэнсе стылю і зьместу».** З першага погляду здаецца патрабаваньне вельмі скромнае: «свабодна выказвацца ў сэнсе стылю». Але мы дасканала ведаем, што ўсякія стылістычныя выкрутасы служаць толькі для таго, каб утаіць сапраўдную думку, каб мець магчымасьць прапагандаваць «японска-ангельска» контр-рэвалюцыйныя ідэі, каб пры дапамозе прытожасьцяй стылю замаскаваць палітычную атруту.

Ясна, што пралетарыят, які будуе ў найцяжэйшых умовах сацыялізм, перамагае непамерныя труднасьці, створаныя супраціўленьнем клясавага ворага, ня можа згадзіцца на прадастаўленьне такой свабоды слова, свабоды контрэвалюцыйнай прапаганды і размагнісваньня волі працоўных мас, бо гэта прапаганда зьяўляецца падрывам нашых сіл, падрывам веры ў нашы сілы і толькі самагубны, а не змагары за справу пралетарыяту або здрадніки маглі-б ісьці на прадастаўленьне клясаваму ворагу такой свабоды слова.

А ў нашай партыі былі такія людзі. Калі мы пераходзілі ад палітыкі ваеннага камунізму на рэйкі новай эканамічнай палітыкі, пасобныя члены нашай партыі лічылі, што гэта паварот да капіталізму. Яны патрабавалі ў выніку, каб партыя зрабіла з гэтага павароту вывод да капіталізму ўсе неабходныя вывады. Гэтыя людзі разважалі прыблізна так: раз партыя паварочвае назад да капіталізму, дык неабходна вярнуцца і да буржуазнай свабоды слова. Нейкі **МЯСЬНІКОЎ**, у той час даволі выдатны член партыі, патрабаваў свабоды слова для ўсіх, у тым ліку і для ворагаў рабочае клясы—свабоды слова ад манархістаў да анархістаў. Ён у гэтым бачыў магчымасьць шырокага разгортваньня таго, што мы называем самакрытыкай. Вы можаце сабе ўявіць, што выкананьні мясьнікоўскага лёзунгу аб свабодзе слова ад манархістаў да анархістаў, якую «самакрытыку» заказ[illegible] мы нам манархіст генэрал **Куцепаў**. [illegible] генэральска-манархістычная «самакрытыка» была-б удушлівай хмарай [illegible], якая прыкрывала-б арганізаваны контр-рэвалюцыйных сіл, што [illegible]ала граніць пралетарскую рэвалюцыю. Свабода слова для манархістаў азначае свабоду мабілізацыі і арганізацыі контр-рэвалюцыйных белагвардзейскіх сіл, і органы гэтай «свабоды слова» былі-б зьяўляючым і арганізуючым цэнтрам расійскай контр-рэвалюцыі. Гэта факт, і гэты факт у нас зразумелы ня толькі піянэрам, але і акцябратам. Ён ня быў зразумелы толькі правым апартуністам або «левакам», тыпу Мясьнікова. Калі буржуазіі не ўдаецца разьбіць пралетарыят у адкрытым баі, дык яна са здавальненьнем згодзіцца на тое, каб разграмець яго абыходным парадкам, скарыстоўваючы адсутнасьць шільнасьці або даверлівасьць рабочае клясы, або яе памылковыя крокі.

Што значыць анархія, якая прапаведуецца анархістамі? Гэта зьнішчэньне ўсякай дзяржаўнай улады, улады, заснаванай на прымусе, значыць, зьнішчэньне і дыктатуры пралетарыяту, бо дыктатура пралетарыяту гэта—канцэнтраваная і ўзброеная ўлада рабочае клясы. Што прапаведуюць анархісты? Яны прапаведуюць зьнішчэньне дыктатуры пралетарыяту сёньня, калі клясы яшчэ не ліквідаваны, калі клясавая барацьба працягваецца. Яны патрабуюць, каб рабочыя масы і бядняцка-сераднякоае сяляцтва, якое ідзе ў саюзе і пад кіраўніцтвам пралетарыяту, разбройся, распусьцілі наш дзяржаўны пралетарскі апарат і яго ўзброены орган ДПУ і Чырвоную армію, каб мы распусьцілі наш савецкі, прафсаюзны і партыйны апарат. Кожны з вас разумее, што рабочая кляса, прарабіўшы такую апэрацыю, стала-б перад сваім непматажным, але дасканала ўзброеным і арганізаваным клясавым ворагам бесадпаможнай і слабой. Бо эксплёататары не пасьледвалі-б добраахвотна нашаму прыкладу. Наадварот, капіталістычныя ваўкі, бачачы, што пралетарыят і працоўныя масы перасталі быць ўзброенымі да зубоў змагарамі, здольнымі біцца не на жыцьцё, а на сьмерць за справу рабочае клясы, што працоўныя масы сталі пазбаўленымі зброі абароны—авечкамі,—схапілі-б нас за горла, каб зьнішчыць і падначаліць сабе. Кожны з вас дасканала ведае, што, калі на вуліцах Варшавы або Вэрліну выступаюць неарганізаваныя натоўпы рабочых па некалькі тысяч чалавек, калі гэтыя натоўпы ня кіруюцца моцнай партыйнай баявой арганізацыяй, калі яны ня маюць зброі ў руках, дык для разгону гэтых дэманстрацый, для падначаленьня мас эксплёататарам, даволі групы паліцэйскіх на матацыклях, атраду конай паліцыі, пажарнай кішкі, і гэты натоўп разганяецца і падначальваецца загадам капіталу. Мы бачым, як група паліцэйскіх з некалькіх дзесяткаў або соцень чалавек трымае ў падначаленьні сотні і сотні тысяч чалавек. Узброены да зубоў і дасканала арганізаваны пласт эксплёататараў, хаця-б параўнаўча ня вельмі шматлікі, можа, дзякуючы зброі і арганізацыі, прымусіць падпраджаваецца мільённыя масы рабочае клясы і працоўных.

Ці можам мы даць свабоду слова людзям, якія прыходзяць да рабочай клясы і прапануюць ёй перад тварам клясавага ворага разбройцца, заяўляючы, што толькі такім чынам мы даб'емся сапраўднай свабоды? Вядома—не, бо анархісцкая прапаганда зьяўляецца такой-жа скрытай формай далямоті клясаваму ворагу, як і работа сацыял-фашыстаў, і па сутнасьці анархісцкая прапаганда служыць а-свойму справе гае-ж клясы, што і прапаганда манархістаў. Для рабочае клясы ідэалёгія манархістаў і ідэалёгія анархістаў зьяўляюцца двума бакамі адной і тэй-жа мэдалі — панаваньня капіталістычнай эксплёатацыі.

Чым зьяўляецца ў сапраўднасьці буржуазная свабода слова?

На гэта пытаньне мы знойдзем вельмі поўны і вычарпальны адказ у **ЛЕНІНА.** Гэтыя словы Леніна нам, рабкорам, калгаскорам, ваенкорам і селькорам трэба добра запамятаць, бо ня раз больш дасталя рабочыя альбо сялянскія масы высоўваюць перад намі гэтыя пытаньні.

Вось, як Ленін характарызаваў буржуазную свабоду друку:

> **«Паны буржуазныя індывідуалісты, мы павінны сказаць вам, што вашы прамовы аб абсалютнай свабодзе адна крывадушнасьць. У грамадзтве, заснаваным на ўладзе грошай, у грамадзтве, дзе масы працоўных цэрпяць нэндзу і жменька багатыроў туняядзічае, ня можа быць «свабоды» рэальнай і сапраўднай. Ці вольны вы ад вашага буржуазнага выдаўцы, пан пісьменьнік? Ад вашай буржуазнай публікі, якая патрабуе ад вас парнаграфіі ў рамках і малюнках, прастытуцыі ў выглядзе «дадатку» да «сьвятога» сэцэнічнага мастацтва? Але-ж гэта абсалютная свабода ёсьць буржуазная ці анархічная фраза (бо, як сьветапогляд, анархізм ёсьць перавернутая на другі бок буржуазнасьць). Жыць у грамадзтве і быць свабодным ад грамадзтва нельга. Свабода буржуазнага пісьменьніка, мастака, актрысы ёсьць толькі замаскаваная (ці крывадушна замаскаваная) залежнасьць ад грошовага мяшка, ад подкупу, ад утрыманьня» (Ленін, том VII, ч. 1-я, стар. 25).**

Гэтыя фармулёўкі Леніна, выказаныя ў 1905 г., знайшлі яшчэ больш яскравае выражэньне ў 1921 г. у тэзісах Леніна аб буржуазнай дэмакратыі і дыктатуры пралетарыяту. З вялізарным сарказмам Ленін арывае ў сваіх тэзісах маску з буржуазнай свабоды друку:

> **... «Свабода друку» таксама служыць адным з галоўных лёзунгаў «чыстай дэмакратыі». Тым ня менш рабочыя ведаюць, а сацыялісты ўсіх краін прызнавалі гэта мільёны разоў, што гэта свабода — зман да таго часу, пакуль лепшыя друкарні і самыя вялікія запасы паперы будуць знаходзіцца ў руках капіталістаў, а ўлада капіталу будзе працягваць панаваць над прэсай, тая ўлада, якая праўляецца ва ўсім сьвеце, тым ясьней, разчэй і цынічней, чым больш разьвітымі аказваюцца дэмакратызм і рэспубліканскі рэжым, як, напрыклад, у Амэрыцы» (Ленін, том XVI, стар. 39-40).**

Таварышы, гэту свабоду друку пабуржуазнаму ленш за ўсё адчуваюць нашы замежныя таварышы. Я ўжо не гавару аб існаваньні цэнзуры. Я не гавару аб тым, што вельмі часта тыя левыя газэты, якія яшчэ не задушаны буржуазіяй, выходзяць скрозь белымі палосамі з адным толькі надпісам: «канфіскавана». Бывае і так, што калі прыходзяць нашы таварышы радыкальныя сялянскія дзеячы ці прыхільнікі барацьбы за дыктатуру пралетарыяту, што ідуць над сьцягам лявіцы ППС у Польшчы, з газэтным матар'ялам, праваным цэнзураю ў друкарню, дык аказваецца, што друкаваць нельга: паліцыя забараніла ўласьніку друкарні прыняць заказ радыкальных левых рабоча-сялянскіх дзеячоў. Наогул, калі ёсьць хоць нязначныя падазрэньні, што асобы, якія зварочваюцца ў друкарню, зьяўляюцца прадстаўнікамі грамадзянскай левай, іх заказаў ня прымаюць, ня друкуюць, ня гледзячы на беспрацоўе і крызіс.

Такую-ж барацьбу вядуць камуністычныя газэты ў краінах, дзе кампартыі існуюць нібы легальна, напрыклад ва **Францыі,** газэта **«ЮМАНІТЭ»,** у **Нямеччыне «РОТЭ ФАНЭ»** і іншыя.

Гэтыя газэты існуюць выключна, дзякуючы вялізарным ахвярам рабочай клясы, якая, пакутуючы ад холаду, голаду і беспрацоўя, ахвяруе апошняе для падтрыманьня свайго баявога органу друку. Наш камуністычны друк заграніцай павінен весьці барацьбу ня толькі супроць цэнзуры, але і супроць магутных буржуазных канцэрнаў, якія кідаюць у рабочыя прадмесьці мільённыя экзэмпляры жоўтага друку пад самымі «чырвонымі» загалоўкамі і за самую танную плату.

Буржуазія можа скарыстоўваць самыя апошнія тэхнічныя вынаходзтвы, усе перавагі капіталістычнай тэхнікі, каб прыцягнуць чытача крыклівасьцю, сэнсацыйнасьцю, вышэйшым цікавым і розманалярвым выглядам за мінімальную, напалову, а то і больш нізкую, чым камуністычны друк, цану. Атрымліваецца так, што на вуліцу Парыжу выходзіць мала сьвядомы рабочы, якому супуць у рукі надрукаваны чырвоным фарбай нумар газэты парфумэрнага караля Коці, пад назвай «Прыяцель народу» за цану ў дзесяць сантымаў, у той час, калі ўсе другія газэты могуць прадавацца ледзь па 20 сантымаў. Маласьвядомы рабочы захапляецца «левым» загалоўкам, надрукаваным чырвонай фарбай, захапляецца таннасьцю і пры дапамозе цэлага роду сенсацыйных выдумак і іншых, адцягваецца ад клясавай барацьбы за зьнішчэньне капіталізму і пабудову сацыялізму.

Буржуазны друк добра служыць сваёй клясе і мы невыпадкова, экспрапрыюючы экспрапрыятараў, у 1917 г. скасавалі права на існаваньне буржуазнага друку. Гэты друк, як казаў тав. Ленін пасьля кастрычніка 1917 г., быў бомбай іншы, дапаўняючай бомбы Каледзіна: «Мы ня можам,—казаў т. Ленін, да бомб Каледзіна дадаваць бомбы іншы. Мы ня можам дапусьціць, каб на франтох грамадзянскай вайны паміраła лепшая частка рабочай клясы ад зброі, і каб унутры краіны атручвалі рабочую клясу іншой буржуазнага друку.

Паглядзеце, таварышы, на шар буржуазнага друку. Разглядзеце ў чым сутнасьць гэтай бомбы іншы?

Для прыкладу возьмем адно пытаньне. Спадзяюся, таварышы, што вы ўсе нагалоўна чыталі апошнюю прамову тав. Сталіна да гаспадарнікаў. Я глыбока зацікаўлены, што вы ўсе гэту прамову моцна запомнілі, гэта-ж вялізарнага значэньня гістарычны дакумант. Невыпадкова, увесь наш друк і друк Савецкага Саюзу і камуністычны друк ўсяго сьвету прысьвяцілі гэтай прамове ня толькі ўступныя артыкулы, але заняліся глыбокай прапрацоўкай гэтай прамовы, і ўсю сваю працу перабудавалі згодна з заданьнямі, якія высунуў тав. Сталін у гэтай прамове.

Буржуазны друк ставіць на ўзаемную прычынную сувязь прамову тав. Сталіна і апошні дэкрэт ЦВК, у якім гаворыцца, што калі раскуланьны кулак на працягу пяці год на месцы сваёй ссылкі вядзе сябе сумленна, дык ён можа быць адноўлен у правах грамадзянства. На гэтай падставе буржуазны друк на Захадзе грубіць у трубы аб адступленьні савецкай улады, аб «новым курсе савецтаў», аб пераходзе «ад мэтаду ваеннага камунізму да мэтаду капіталістычнага буржуазнага кіраўніцтва». Для нас з вамі тут, у БССР, наогул у Савецкім Саюзе, гэтыя заявы буржуазнага друку выклікаюць гранічныя адносіны. Але там, на Захадзе, гэтыя дзікія выдумкі і нахабная фальш разьлічаны на тое, каб падарваць веру рабочых мас у наша будаўніцтва, каб паралізаваць іх волю да барацьбы за зьнішчэньне капіталістычнага парадку і ўстаноўленьне дыктатуры пралетарыяту.

Вось што, літаральна, піша «Кур'ер Віленскі»:

> **«Новы курс адзначае ў першую чаргу некаторае примірэньне са старай прафэсыянальнай інтэлігенцыяй, уцягненьне ў работу некаторых беспартыйных колаў, а таксама некаторае зьмякчэньне мэтадаў, якія ўжываліся дагэтуль у адносінах да так званых кулакоў».**

Адкуль орган віленскіх пілсудчыкаў-фашыстаў у ліберальнай вопратцы, узяў, што наша партыя лічыць неабходным прымірыцца са старай прафэсыянальнай інтэлігенцыяй? Зразумела, не. Ці-ж кулацкая ўраўнілаўка зьяўляецца камуністычным прынцыпам заработнай платы, а зьдзельшчына ці прэміяльная сыстэма заработнай платы ў адпаведнасьці з якасьцю працы зьяўляецца адзнакай капіталізму? Але-ж у Форда, сыстэма якога зьяўляецца квінт-эсэнцыяй капіталістычнай эксплёатацыі, няма зьдзельшчыны, а ёсьць падзённая заработная плата і патагонная сыстэма, заснаваная на хуткім руху канвэйера і пагрозе галоднай сьмерці, калі рабочы в работай ля канвэйера, які шалёна рухаецца, ня справіцца. Для чаго буржуазны друк, такім чынам, скажае зьмест прамовы тав. Сталіна? Адказ ясны. Буржуазнаму друку рабочыя, батракі і беднякі ня вераць. Для іх наша будаўніцтва зьяўляецца лепшым прыкладам барацьбы за сацыялізм і шляхаводнай зоркай. Вось чаму яны кідаюць бомбы хлусьні аб тым, што быццам тав Сталін — прагматыр сусьветнага пралетарыяту, якому вы, заходнія таварышы, верыце, гаворыць аб абмежаваньні заяваючых пралетарыятам правоў. Сэнс гэтай хлусьні зводзіцца да таго, каб пераканаць рэвалюцыйныя масы Захаду, якія пачынаюць усё больш бунтаваць у сувязі з крызісам і беспрацоўем, што ўсе шляхі вядуць, урэшце, да абмежаваньня праноў пралетарыяту, нават калі ён заваюе сабе панаваньне. Буржуазны друк і яго тэлеграфныя агэнцтвы ў момант разгортваньня крызісу капіталістычнай сыстэмы прабуюць паралізаваць волю да барацьбы пралетарыяту і ў Савецкім Саюзе мае месца банкрутства сацыялістычнай гаспадаркі, банкрутства пралетарскага мэтаду гаспадарчага будаўніцтва, што гэты мэтад сябе не апраўдаў, што ў выніку бальшавіцкіх экспэрыментаў на чатырнаццатым годзе рэвалюцыі ёсьць паварот на шлях капіталізму.

Рост беспрацоўя, банкрутства буйнейшых банкаў, наўпрыпенасьць буржуазіі ў заўтрашнім дні, абгастрэньне клясавай барацьбы сагрэцкіх сялянскіх мас — вось фон буржуазнай іншы. Ад сюль тлумачэньні прамовы тав. Сталіна і апошніх дэкрэтаў савецкай улады. Па думцы «Газэты Пэльскай» — лейб-органу фашысцкага ўраду ў Польшчы—«раз'яснэньне сталіна адносна зьмены курсу савецкай палітыкі аформілася тыдзень назад, пад уплывам данясеньняў аб катастрафічным становішчы прамысловасьці, а таксама аб небясьпечным хваляваньні сярод рабочых». Гэта ў [illegible] выдуманая сэнсацыя можа выклікаць у нашых радох толькі гасьбы сьмех.

Рыскія карэспандэнты нават ведаюць, што «зрыў пяцігодні набыў, што настолькі вырэзныя формы, што таварыства так званых «старых бальшавікоў» выслала дэлегацыю бальшавікоў» (гучныя выбухі сьмеху). Чытаю і вачом ня веру. Аказваецца, што я, напрыклад, член таварыства «старых бальшавікоў», ня ведаў аб тым, што я галасаваў за пасылку дэлегацыі да прэзыдыума нашай партыі тав. Сталіна, каб пераканаць партыі тав. Сталіна, каб пераканаць яго ў неабходнасьці зьмяніць курс, і аб гэтым я ўсім даведаўся толькі з лейб-органу пілсудчыкаў. (Сьмех).

Гэта «утка» буржуазнага друку, якая дае вам меру таго, што называецца на буржуазнаму «аб'ектыўнай» праўдай і для чаго служыць буржуазіі свабода слова, патрэбна была з надвойнай мэтай: па-першае, каб рабочым Захаду сказаць, што рэвалюцыя заўсёды канчаецца контр-рэвалюцыяй, і тое, супроць чаго бальшавікі ў 1921 г. змагаліся, а імянна супроць контр-рэвалюцыйнага лёзунгу: «Саветы без камуністаў», яны самі быццам праводзяць у 1931 г. — у трэцім годзе пераходнага жэнэцыйуальнага пяцігодзі за чагары гады; па-другое, буржуазны друк прабаваў утаіць перад рабочымі і дробна-буржуазнымі масамі Захаду тое вялізарнае ўражаньне на маладых вучоных, якое зрабіла выступленьне бацькоўскай дэлегацыі навуковых працаўнікоў на Лёндзанскім кангрэсе, прысьвечаным гісторыі тэхнікі. Буржуазія на час дакладу савецкіх дэлегатаў абвясьціла пасьпяшаньне кангрэсу закрытым і забараніла агалашаць стэнаграмы дакладаў. Аднак, утаіць вялізарнае рэвалюцыянізуючае значэньне дакладу савецкіх вучоных, іх выступленьні ў абарону дыялектычнага матэрыялізму, іх атаку на цьвярдыні буржуазнага контр-рэвалюцыйнага сьветапогляду нельга было, таму буржуазны друк прабаваў паралізаваць дзейнасьць выступленьня савецкай дэлегацыі шляхам гэтых недарэчных выдумак, якія у вас з намі выклікаюць выбухі жыцьцярадаснага сьмеху.

Гэтыя прыклады, якія я прыводзіў, зьяўляюцца лепшым выкрыцьцём сутнасьці буржуазнага друку, сутнасьці таго, што ўтойваецца пад назвай буржуазнай свабоды слова. Гэта свабода хлусьні, свабода атручваньня працоўных мас.

3. „Свабода“ друку буржуазіі—свабода хлусьні і паклёпу, свабода атручваньня працоўных мас

Аб іншых гаварыць ня буду. Кожны з вас у гэтай іншы добра разьбіраецца. На глупстве я некалькі затрымаюся.

Буржуазны друк гаворыць аб адмаўленьні ад камуністычных мэтадаў працы і заработнай платы. Ці-ж тав. Сталін заклікаў да таго, каб адмовіцца ад вялізарнейшага вагара сацыялістычнага будаўніцтва — ад сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва? Ці-ж тав. Сталін заклікаў рабочую клясу СССР вярнуцца да такіх адносін да працы, якія рабочая кляса мае ва ўмовах капіталістычнай эксплёатацыі, значыць да работы з-пад палкі, да працы нявопнакантроўнай? Зразумела, не. Ці-ж кулацкая ўраўнілаўка зьяўляецца камуністычным прынцыпам заработнай платы, а зьдзельшчына ці прэміяльная сыстэма заработнай платы ў адпаведнасьці з якасьцю працы зьяўляецца адзнакай капіталізму? Але-ж у Форда, сыстэма якога зьяўляецца квінт-эсэнцыяй капіталістычнай эксплёатацыі, няма зьдзельшчыны, а ёсьць падзённая заработная плата і патагонная сыстэма, заснаваная на хуткім руху канвэйера і пагрозе галоднай сьмерці, калі рабочы в работай ля канвэйера, які шалёна рухаецца, ня справіцца. Для чаго буржуазны друк, такім чынам, скажае зьмест прамовы тав. Сталіна? Адказ ясны. Буржуазнаму друку рабочыя, батракі і беднякі ня вераць. Для іх наша будаўніцтва зьяўляецца лепшым прыкладам барацьбы за сацыялізм і шляхаводнай зоркай. Вось чаму яны кідаюць бомбы хлусьні аб тым, што быццам тав Сталін — прагматыр сусьветнага пралетарыяту, якому вы, заходнія таварышы, верыце, гаворыць аб абмежаваньні заяваючых пралетарыятам правоў. Сэнс гэтай хлусьні зводзіцца да таго, каб пераканаць рэвалюцыйныя масы Захаду, якія пачынаюць усё больш бунтаваць у сувязі з крызісам і беспрацоўем, што ўсе шляхі вядуць, урэшце, да абмежаваньня правоў пралетарыяту.

Аб чым гаворыць буржуазны друк і яго тэлеграфныя агэнцтвы ў момант разгортваньня крызісу капіталістычнай сыстэмы? Ён прабуе паралізаваць волю да барацьбы пралетарскіх мас указаньнем, што барацьбы рабочых мас указаньнем, што ў Савецкім Саюзе мае месца банкрутства сацыялістычнай гаспадаркі, банкрутства пралетарскага мэтаду гаспадарчага будаўніцтва, што гэты мэтад сябе не апраўдаў, што ў выніку бальшавіцкіх экспэрыментаў на чатырнаццатым годзе рэвалюцыі ёсьць паварот на шлях капіталізму.

Рост беспрацоўя, банкрутства буйнейшых банкаў, наўпрыпенасьць буржуазіі ў заўтрашнім дні, абгастрэньне клясавай барацьбы сагрэцкіх сялянскіх мас — вось фон буржуазнай іншы. Ад сюль тлумачэньні прамовы тав. Сталіна і апошніх дэкрэтаў савецкай улады. Па думцы «Газэты Пэльскай» — лейб-органу фашысцкага ўраду ў Польшчы—«раз'яснэньне сталіна адносна зьмены курсу савецкай палітыкі аформілася тыдзень назад, пад уплывам данясеньняў аб катастрафічным становішчы прамысловасьці, а таксама аб небясьпечным хваляваньні сярод рабочых». Гэта ў [illegible] выдуманая сэнсацыя можа выклікаць у нашых радох толькі гасьбы сьмех.

Рыскія карэспандэнты нават ведаюць, што «зрыў пяцігодні набыў, што настолькі вырэзныя формы, што таварыства так званых «старых таварыства» выслала дэлегацыю бальшавікоў» (гучныя выбухі сьмеху). Чытаю і вачом ня веру. Аказваецца, што я, напрыклад, член таварыства «старых бальшавікоў», ня ведаў аб тым, што я галасаваў за пасылку дэлегацыі да прэзыдыума нашай партыі тав. Сталіна, каб пераканаць партыі тав. Сталіна, каб пераканаць яго ў неабходнасьці зьмяніць курс, і аб гэтым я ўсім даведаўся толькі з лейб-органу пілсудчыкаў. (Сьмех).

Гэта «утка» буржуазнага друку, якая дае вам меру таго, што называецца на буржуазнаму «аб'ектыўнай» праўдай і для чаго служыць буржуазіі свабода слова, патрэбна была з надвойнай мэтай: па-першае, каб рабочым Захаду сказаць, што рэвалюцыя заўсёды канчаецца контр-рэвалюцыяй, і тое, супроць чаго бальшавікі ў 1921 г. змагаліся, а імянна супроць контр-рэвалюцыйнага лёзунгу: «Саветы без камуністаў», яны самі быццам праводзяць у 1931 г. — у трэцім годзе пераходнага жэнэцыйуальнага пяцігодзі за чагары гады; па-другое, буржуазны друк прабаваў утаіць перад рабочымі і дробна-буржуазнымі масамі Захаду тое вялізарнае ўражаньне на маладых вучоных, якое зрабіла выступленьне бацькоўскай дэлегацыі навуковых працаўнікоў на Лёндзанскім кангрэсе, прысьвечаным гісторыі тэхнікі. Буржуазія на час дакладу савецкіх дэлегатаў абвясьціла пасьпяшаньне кангрэсу закрытым і забараніла агалашаць стэнаграмы дакладаў. Аднак, утаіць вялізарнае рэвалюцыянізуючае значэньне дакладу савецкіх вучоных, іх выступленьні ў абарону дыялектычнага матэрыялізму, іх атаку на цьвярдыні буржуазнага контр-рэвалюцыйнага сьветапогляду нельга было, таму буржуазны друк прабаваў паралізаваць дзейнасьць выступленьня савецкай дэлегацыі шляхам гэтых недарэчных выдумак, якія у вас з намі выклікаюць выбухі жыцьцярадаснага сьмеху.

Гэтыя прыклады, якія я прыводзіў, зьяўляюцца лепшым выкрыцьцём сутнасьці буржуазнага друку, сутнасьці таго, што ўтойваецца пад назвай буржуазнай свабоды слова. Гэта свабода хлусьні, свабода атручваньня працоўных мас.

4. Сацыял-фашысцкі друк—лёкай капіталізму

Нельга, аднак, канчаць справу па буржуазным друку. Неабходна пазнаёміцца, для чаго служыць буржуазная свабода слова **меншавіком-сацыял-фашыстам.** Рухаючай сілай сацыял-фашызму зьяўляецца таксама, як і ў буржуазіі, сьмяротны страх перад нашымі дасягненьнямі, перад нашым рухам наперад да сацыялізму. Сацыял-фашысты прабуюць пераканаць рабочых Захаду сьледам за буржуазным друкам, што няма для чаго рабіць рэвалюцыі, бо кожная рэвалюцыя канчаецца контр-рэвалюцыяй. Інакш гэту думку праводзіць друк, што прадстаўляе гаспадароў, інакш лёкаі з сацыял-фашысцкіх партый. Усё пытаньне толькі ў слоўным афармленьні. Сацыял-фашысты паралізуюць барацьбу рабочай клясы шляхам спэкуляцыі на левай апазыцыйнай фразе. Вось прыклады.

Да нас нядаўна ў Савецкі Саюз прыяжджала дэлегацыя польскіх капіталістаў. Польскія буржуа прыехалі да нас рабіць справы і бліжэй пазнаёміцца са сваім сьмяротным ворагам, праверыць яго сілы і магчымасьці. Буржуазія, зразумела, зацікаўлена ў тым, каб сярод рабочых і дробна-буржуазных мас пашырыць аб нас хлусьню, каб утаіць аб нас праўду. Аднак, для сябе яна хоча ведаць аб нас праўду, бо стары стратэгічны прынцып абвяшчае: «ворага неабходна дакладна ведаць, трэба ведаць яго слабыя бакі, але не перамяшчаць яго моцных бакоў». Таму даклад лідэра польскіх капіталістаў **Вяржбіцкага** заключае вельмі многа цікавых заўваг, якія адлюстроўваюць сапраўднае становішча спраў у Савецкім Саюзе. Зразумела, побач з гэтымі заўвагамі ёсьць рад іншых, якія проста могуць выклікаць у нас пранённыя адносіны і сумненьне наконт разумовых здольнасьцяй лідэра польскай буржуазіі.

Сацыял-фашыст зацікаўлен у адным: захаваць лад капіталістычнай эксплёатацыі і сваё цёплае месца. Але гэта можна зрабіць толькі такім чынам, каб увесь час сядзець на двух крэслах: гасіць пажар пралетарскай рэвалюцыі і адначасова рабіць апазыцыйны шум. І капітал набыць, і цноту захаваць. Таму, ня ў прыклад капіталістам, яны ніводнага слова праўды аб Савецкім Саюзе на свае старонкі не прапускаюць і агітна хлусяць пра Савецкі Саюз. Нядаўна «Роботнік» — орган польскіх сацыял-фашыстаў — выступаў з артыкулам пад назвай «Абальшавічаньня прамысловасьці». У гэтым артыкуле сацыял-фашысцкі прахвост даказвае, што:

> **«У сучасны момант прамысловцы пытаньне аб савецкіх заказах пакінулі ў баку, затое яны захапляюцца ўмовамі, у якіх працуюць рабочыя ў Саветах і здзівіны іх марай зьяўляецца ўвядзеньне гэтых рабскіх умоў у Польшчы».**

Захапляюцца, значыцца «рабскімі» 7-гадз. працоўным днём, «рабскім» сацыяльным страхаваньнем за кошт прадпрыемстваў. Кожны з нас разумее, што няма нічога больш карыснага для польскіх рабочых, як увесьці ў Польшчы гэтыя «рабскія» ўмовы. Чаму-ж яны ня ўводзяць, чаму выступаюць супроць 8 гадз. працоўнага дня нават на паперы, чаму прымушаюць працаваць па 14 і нават 16 гадзін у суткі, чаму пратэстуюць нават супроць фашысцкага сацстрахаваньня, якое рабуе адну трацюю узносаў на сацыяльн

Нарада сакратароў сельпарткомаў пры ЦК КП(б)Б

ПЕРАБУДАВАЦЬ ПАРТЫЙНУЮ РАБОТУ НА ВЕСЦЫ

АПАД—РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ

120 ВАГОНАЎ штодзенна завозіць у Менск

Усе прадпрыемствы і ФЗМК нясуць, нараўне з Лесбелам, поўную адказнасьць за выкананьне пляну завозу дроў у Менск

346 ТЫСЯЧ КБМ. ДРОЎ ЛЯЖАЦЬ У ЛЕСЕ

ЛЕСПРАМГАСЫ, ПРЫМАЦАВАНЫЯ ДА МЕНСКУ, НЯ ПРЫМАЮЦЬ МЕР ДА ІХ АДГРУЗКІ

Прэзыдыум Менгарпрафсавету абгаварыў пытаньне аб ходзе загатовак і вывазкі дроў.

Ня гледзячы на пасылку для дапамогі Лесбелу больш 28 рабочых брыгад (звыш 70 чал.) і 1.200 дружыньнікаў для непасраднай работы па загатоўцы дроў, дагэтуль няма перахому ў забесьпячэньні Менску дрывамі. Замест 100 вагонаў штодзенна прыбывае ў сярэднім 20.

Гэта зьяўляецца вынікам абсалютнай бязьдзейнасьці Лесбелу і леспрамгасаў, якія не прынялі мер, каб адгрузіць 346 тыс. кбм. дроў, якія ляжаць у леспрамгасах, што прымацаваны да Менску.

Лесбел і леспрамгасы дагэтуль не скарысталі адпушчаных фондаў прамтавараў (1.000 пар ботаў, 1.200 пар абутку, на 5 тыс. руб. гатовай вопраткі) для вярбоўкі рабочай сілы. Дагэтуль завербавана ня больш 10 чал. Есьць выпадкі, калі дваццатнікі заяўляюць рабочым брыгадам: «Вы, брыгады, працуйце, а мы будзем вам дапамагаць».

Лесбел ня прыняў мер для падрыхтоўкі харчаваньня для пасланых дружын і брыгад.

Рад месцовых арганізацый, ня гледзячы на дырэктывы, не дапамагаюць брыгадам у справе вярбоўкі рабсілы і мабілізацыі грамадзкасьці.

Рад прадпрыемстваў (ЦРК, Паперабф'яднаньне, шчотачная фабрыка, «Кастрычнік», «Дрэваапрацоўшчык» і г. д.) дагэтуль не вразумелі той адказнасьці, якую яны нясуць за забесьпячэньне гораду дрывамі.

Яны павінны раўняцца па друкарні ім Сталіна, мэдінстытуце, камвузе, Бежыцкасюве, якія паказалі бальшавіцкія тэмпы барацьбы за апал.

Прэзыдыум Менгарпрафсавету прапанаваў Лесбелу прыняць надзвычайныя меры, каб фарсаваць адгрузку дроў, каб забясьпечыць штодзеннае паступленьне ў Менск ня менш 120 вагонаў і вярбоўку ня менш 3 тыс. рабочых. Усе фонды прамтавараў павінны быць зараз-жа спушчаны да вучасткаў.

Прэзыдыум гарпрафсавету папярэдзіў усе прадпрыемствы і прафарганізацыі, што яны разам з Лесбелам нясуць поўную адказнасьць за выкананьне пляну загатоўкі і завозу дроў.

НАЛАДЗІЦЬ УЛІК ЗАВОЗУ ДРОЎ

Улік завозу дроў у Менск не наладжан. Ні Лесбел, ні Саюзтранс ня ведаюць, колькі дроў паступае штодзенна ў Менск.

Як можна кіраваць справай адгрузкі дроў, калі няма ўліку?

Мы патрабуем ад Лесбелу і Саюзтрансу неадкладна наладзіць улік завозу дроў, каб змагацца з прарывамі, каб поўнасьцю забясьпечыць патрэбу Менску ў дрывах.

У АДПАВЕДНАСЬЦІ З НОВЫМІ ЎМОВАМІ І ЗАДАЧАМІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

СЕЛЬПАРТКОМЫ—АПОРНЫЯ ПУНКТЫ РАЙКОМАЎ КП(б)Б

Учора закончылася пры ЦК КП(б)Б нарада сакратароў сельпарткомаў. Асноўным пытаньнем на нарадзе было абмеркаваньне задач сельпарткомаў у справе перабудовы партработы на вёсцы, перабудовы ў адпаведнасьці з новымі задачамі сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва.

На аснове цьвёрдага і няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, разам з посьпехамі індустрыялізацыі краіны, карэннай рэканструкцыяй прамысловасьці, вялізарнейшыя дасягненьні набыты ў справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Наша задача, замацоўваючы дасягнутыя посьпехі, яшчэ больш шпаркімі тэмпамі прасоўвацца наперад да новых перамог сацыялістычнага будаўніцтва, ламаючы на сваім шляху супраціўленьне клясавага ворага, перамагаючы перашкоды і тормазы правых апартуністаў і іх саюзьнікаў—«левых» загібшчыкаў.

Ліпеньскі пленум ЦК КП(б)Б у галіне далейшай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі паставіў перад усёй партарганізацыяй задачу давесьці да пачатку веснавой сяўбы калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР да 75 проц. і завяршыць у асноўным калектывізацыю на працягу 1932 году.

Гэта задача будзе выканана пры ўмовах узмацненьня работы вясковых партарганізацый, узьняцьця іх кіруючай ролі ў сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. Замацаваньне існуючых калгасаў шляхам правільнай арганізацыі працы, укараненьня ва ўсіх галінах работы зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі, безадказнасьці ў рабоце, падрыхтоўкі і вылучэньня кадраў калгаснага будаўніцтва ня толькі з партыйцаў, а і з шырокага калгаснага актыву, забесьпячэньня посьпеху ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі — усё гэта зьяўляецца неабходнай умовай узьняцьця калгаснага руху на вышэйшую ступень, неабходнай умовай забесьпячэньня выкананьня дырэктыў ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб завяршэньні ў асноўным калектывізацыі ў 1932 годзе. Выкананьне гэтых задач па забесьпячэньні далейшых посьпехаў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ўмацуе мысліць без рашучай і неадкладнай перабудовы ўсёй партыйнай і савецкай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы.

Вясковыя партарганізацыі за апошнія гады, асабліва з часу ліквідацыі акруг і пераразьменьня цэнтру цяжару работы ў раён — асноўнае зьвяно сацыялістычнай перабудовы вёскі—значна ўзмацніліся, і работа іх, бясспрэчна, палепшылася. Большасьць раённых партарганізацый з посьпехам выконвае ўсе чарговыя задачы партыі на вёсцы. Разам з гэтым трэба з усёй сілай падкрэсьліць адставаньне раду вясковых партарганізацый ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, ад узрастаючых новых задач работы. Вясковыя парт'ячэйкі яшчэ слаба працуюць, многія з іх не спраўляюцца з пастаўленымі задачамі і па сваім складзе зьяўляюцца вельмі малаколькаснымі. Пашырэньне сеткі парт'ячэек у вёсцы, рост іх за лік с.-г. рабочых, батракоў і калгаснага актыву праходзіць зусім нездавальняюча пры ўмовах значна пашыранай на вёсцы базы для росту. **База для росту вясковых партарганізацый—вялізарнейшая.** Па 30 МТС, якія працуюць у БССР, толькі кваліфікаваных рабочых з вялікім вытворчым стажам налічваецца больш тысячы чалавек, у саўгасах—9.000 с.-г. рабочых і шматтысячны калгасны актыў. Узмацненьне вярбоўкі ў партыю рабочых МТС, саўгасных рабочых і калгаснага актыву, увязка вярбоўкі з штодзённай работай зьяўляюцца адной з важнейшых умоў узмацненьня партыйных ячэек у вёсцы і паляпшэньня іх работы.

Перад раённымі партыйнымі арганізацыямі ва ўсёй шырыні зараз паўстае задача **стварыць моцныя вясковыя парт'ячэйкі, узьняць іх работу на вышэйшую ступень, павысіць авангардную ролю ў сацыялістычным будаўніцтве, перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі, правільна расставіць партыйныя сілы, пераключыцца на канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва, дабіваючыся бязумоўнага павышэньня адказнасьці кожнага партыйца** за даручаную работу.

У перабудове партыйнай работы на вёсцы трэба выходзіць з дырэктыў XVI партзьезду аб тым, каб ператварыць калгасы і саўгасы ў апорныя пункты партыйнай работы на вёсцы. Трэба адзначыць, што перабудова работы вясковых партарганізацый праходзіць **марудна.** Дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове выконваюцца яшчэ невыстарчальна. Толькі месяц таму назад, а ў іншых раённых партарганізацыях яшчэ пазьней пачаліся арганізоўвацца сельпарткомы. Арганізавана ўжо 75 сельпарткомаў. Але, ня гледзячы на пядаўнюю іх арганізацыю, толькі першыя крокі іх дзейнасьці, ужо гэты пачатковы вопыт паказвае, што сельпарткомы пры правільнай пастаноўцы іх работы — важнейшы фактар у справе забесьпячэньня апэрацыйнасьці работы вясковых партарганізацый.

Сельпарткомы, як правіла, арганізуюцца па **вытворчым** прынцыпе, а не тэрытарыяльным, г. зн., што яны ахапляюць сваім кіраўніцтвам (у радыусе ня больш 10-12 клм.) **саўгасныя** ячэйкі, **калгасныя, вясковыя** і ячэйкі невялікіх прадпрыемстваў, якія пераапрацоўваюць с.-г. прадукцыю. Што-ж датычыць такіх ячэек, як транспартныя, будаўнічыя і інш., яны застаюцца самастойнымі ячэйкамі, хаця-б знаходзіліся і на тэрыторыі абслугоўваньня сельпарткомаў. СПК павінны быць арганізаваны пры буйнейшых апорных парт'ячэйках саўгасаў, МТС ці калгасаў з ахопам ня менш 35 камуністаў наўкольных ячэек.

Між тым, у паасобных арганізацыях ёсьць неразуменьне як арганізацыйнай пабудовы сельпарткомаў, так і іх значэньня. Напрыклад, у **Барысаўскім** раёне з пяці сельпарткомаў чатыры арганізаваны не пры апорных буйнейшых ячэйках саўгасаў і калгасаў, а пры сельсавецкіх ячэйках. Паасобныя райкомы зразумелі месца сельпарткомаў ня як сваіх **апорных пунктаў,** а як перадатачных пунктаў, як нешта накшталт падрайкомаў. Такія погляды зусім няправільныя. Райкомы ні ў якім разе не павінны адрываць сельпарткомы ад жывога кіраўніцтва ячэйкамі, ад канкрэтнай работы партбаваньнем розных вестак. Сельпарткомы ня маюць тэхнічных работнікаў і ніякай пісанінай не павінны займацца. Ніякія цыркуляры ў парадку кіраўніцтва работай ячэек не павінны пасылацца сельпарткомамі, іх кіраўніцтва павінна быць жывое, канкрэтнае, апэрацыйнае. Стварэньнем інстытуту сельпарткомаў ніколькі ня зьнімаецца і не памяншаецца адказнасьць райкомаў за работу ячэек, якія абслугоўваюцца сельпарткомамі.

Нарада сакратароў сельпарткомаў вырашыла і рад пытаньняў арганізацыйнага парадку і гэтым самым унесла якасьць у іх работу.

Па аснове дырэктыў партыі аб перабудове партыйнай работы на вёсцы і канкрэтных прапаноў, прынятых нарадай, задача раённых партарганізацый — забясьпечыць узмацненьне вясковых парт'ячэек, узьняць на вышэйшую ступень іх авангардную ролю ў сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі.

ПАПЕРУ—КРАІНЕ

АБЯЗЬЛІЧКА— біч фабрыкі „Гэрой працы“

„Ліквідаваць цякучасьць рабочай сілы, зьнішчыць ураўнілаўку, правільна арганізаваць зарплату, палепшыць бытавыя ўмовы рабочых,—такава задача“ (СТАЛІН).

Становішча на Добрускай фабрыцы «Гэрой працы» характарызуецца наступным чынам: дрэнная арганізацыя кіраўніцтва, адсутнасьць адказнасьці за работу, поўная абязьлічка, безгаспадарчасьць ўраўнілаўка ў зарплаце. Калі да гэтага дадаць тое, што будаўніцтва на фабрыцы праводзілася без каштарысаў, што грашовыя выдаткі робяцца бессправаздачна, што няма ніякай плянавасьці ў рабоце, што спаборніцтва і ўдарніцтва з прычыны адсутнасьці кіраўніцтва фактычна знаходзяцца ў заняпадзе, што адносіны да рэалізацыі рабочых прапаноў — самыя няўважлівыя, — стане зразумелая праца былога апартуністычнага кіраўніцтва фабрыкі, якая давяла да 23—30% выкананьня пляну.

Вялікай перашкодай у рабоце фабрыкі зьяўляецца таксама і тое, што торфазавод «Шлях сацыялізму» плян забесьпячэньня фабрыкі торфам выконвае толькі на 40%. Невыкананьне пляну торфа забесьпячэньня тлумачыцца таксама дрэннай арганізацыяй працы, адсутнасьцю ўліку, поўнай абязьлічкай, якая пануе ў торфапагрузачнай, і ўраўнілаўкай у заработнай плаце: аплата рабочых да гэтага часу існавала аднолькавая як для тых, якія цягнулі торф за 50 мэтраў так і за 5 мэтраў. Характэрна адзначыць, што ў выніку абязьлічкі і безадказнасьць да інструментаў часта бываюць выпадкі, што кінутыя лапаты ў вагонэтку трапляюць непасрэдна з торфапагрузачнай у бункер.

Каб узяць малюнак росту браку і поўнай безадказнасьці да работы, досыць падаць такі факт, што калі повы дырэктар у ночы абыходзіў фабрыку, дык постая машына, галоўная на фабрыцы, ня было амаль відаць з-за гары браку.

На фабрыцы груба парушалася дырэктыва аб адзінаначальні. Ня было выразнага разьмяжкаваньня функцый паміж аддзеламі. Гэта даводзіла да таго, што за рознымі дробязямі аваравалася да дырэктара фабрыкі, бо ніхто іншы, акрамя яго, ня мог іх вырашыць. Для атрыманьня аднаго кілёграму цьвікоў вяліся перагаворы на працягу 20 дзён паміж двума адделамі забесьпячэньня, а ў гэты час брыгада рабочых стаяла без працы, бо чакала атрыманьня цьвікоў.

Аб дрэннай арганізацыі кіраўніцтва лепш за ўсё сьведчыць той факт, што дырэкцыя да гэтага часу ня мела схэмы кіраўніцтва прадпрыемствам.

Дрэнна пастаўлена складская гаспадарка на фабрыцы. Каштоўныя запасы розных матар'ялаў і сырцу ляжаць проста на зямлі без падсьцілак. Імпартнае абсталяваньне звалена ў кучы без ніякага парадку.

Новае будаўніцтва аддзелаў фабрыкі праводзіцца бяз усякіх каштарысаў. Няма ўліку выдаткаў будаўнічых матар'ялаў, няма ўліку рабочай сілы, не вядуцца графікі выкананьня работ. Адсутнічае крэдытная дысцыпліна. 500.000 руб., якія прызначаліся на будаўніцтва, выдаткаваны на іншыя патрэбы.

Да апошніх дзён пытаньню падрыхтоўкі кадраў на фабрыцы не аддавалася ніякай увагі. Фабзавуч, які існуе пры фабрыцы, прарываў бяз усякага кіраўніцтва і ўвагі з боку фабрычных арганізацый.

Гаспадарчае кіраўніцтва фабрыкі не стварыла адпаведных умоў для работы спэцыялістаў. Буйнейшы спэцыяліст папяровай прамысловасьці, інжынэр Богаяспоўскі заўсёды сустракаў перашкоды ў сваёй рабоце. Характэрна, што зараз пасьля зьмены дырэктара гэты буйнейшы спэцыяліст цалкам аддаўся вытворчасьці, працуючы без абмежаваньня часу днём і ноччу.

Усе пералічаныя факты паказваюць на тое хлопчынае становішча, адсутнасьць арганізацыйнай сыстэмы ў гаспадарчага кіраўніцтва, безгаспадарчасьць і бесплянаваньне, якія існавалі на фабрыцы да апошняга часу.

Новаму гаспадарчаму кіраўніцтву фабрыкі пад кіраўніцтвам партарганізацыі прадстаіць вялізарная работа па перабудове ўсёй работы па-новаму, па наладжаньні ў першую чаргу правільнай арганізацыі кіраўніцтва па зьнішчэньні абязьлічкі і ўстанаўленьні цьвёрдай адказнасьці кожнага працаўніка на сваім вучастку работы, а таксама па зьнішчэньні ўраўнілаўкі, якая падрывала прадукцыйнасьць працы і прыводзіла да цякучасьці рабочай сілы. Кожны работнік павінен дакладна ведаць сваю работу, за што ён адказвае.

Неабходна стварыць транспартны аддзел, які павінен канцэнтраваць у сваіх руках і адказваць за ўвесь транспарт фабрыкі.

Неабходна тэрмінова ўкараніць гаспадарчы разрахунак на ўсе зьвеньні работы, наладзіць збор рабочых прапаноў.

Трэба зараз-жа заказаць чарцяжы па рэканструкцыі топак для сілавой станцыі, каб прыстасаваць іх для розных гатункаў торфу і наладзіць вывучэньне працы другой і шостай машын з мэтай максымальнага ўзьняцьця іх прадукцыйнасьці.

Максымум увагі трэба зьвярнуць на наладжваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, якое да гэтага часу праводзілася бяз ніякага кіраўніцтва.

Новае гаспадарчае кіраўніцтва фабрыкі павінна ўзначаліць энтузіязм рабочых, што бязумоўна забясьпечыць ліквідацыю прарыву.

Выязная брыгада «Зьвязды» і МенАПП: А. Манькоў, З. Астапенка, П. Броўка, А. Вольны і Даўгапольскі.

Прарыў паглыбляецца

ЗАМЕСТ 110 ТОН—24

ДОБРУШ. (Брыгада «Зьвязды».) На ф-цы «Гэрой працы» сутачнае заданьне 110 тон. Выпрацавана 16 ліпеня 64 тоны. За тым пашло зьніжэньне: 17 ліпеня 42 тоны, 18 ліпеня 24 тоны. У апошні дзень быў прастой на працягу 74 гадзіны. Стаялі ўсе машыны. Асноўная прычына — недахват энэргіі і дрэнная работа пагрузачнай.

Адкрыты ліст старшын ЦКК-РСІ тав. Калініну

Яшчэ ў 1929 годзе прыступілі да пабудовы ў Магілеве кватар для рабочых гарбарні імя Сталіна. Праект пабудовы быў зацьверджан ВСНГБ і іншымі арганізацыямі. Гэты праект прадугледжваў правядзеньне паравога ацяпленьня. Апрача грошай гаспадарчых арганізацый у будаўніцтва было ўкладзена 342.000 руб. з фонду паляпшэньня быту.

Будаўніцтва трэба было праводзіць фарсаванымі тэмпамі, бо жыльлёвае становішча рабочых было вельмі цяжкое — на магілёўскую гарбарню былі перакінуты рабочыя-гарбары Менску і Гомелю. Гэтыя рабочыя жылі ў інтэрнатах, а сем'і знаходзіліся ў Менску і Магілеве.

ВСНГБ і Белскураб'яднаньне пічылі, што пабудова будзе скончана ў пістадзе 1930 году, між тым, сканчэньне будаўніцтва затрымліваецца і па сёньняшні дзень. Галоўная прычына — адсутнасьць радыятара для паравога ацяпленьня.

ВСНГБ прапануе зараз адмовіцца ад паравога ацяпленьня і ўстанавіць печы.

Гэта прапанова ня толькі нямэтазгодная, але проста шкодная, бо трэба разбурыць сьцены, падлогі, устанавіць дадатковыя фундаманты пад печы і г. д.

У свой час былі закуплены радыятары для пабудовы новага корпусу віцебскай абутковай фабрыкі. Будаўніцтва гэтага корпусу зараз спынена. Трэба было перакінуць гэтыя радыятары ў Магілеў, але «Сантэхбуд» забраў іх для Дому Ураду.

Такое становішча зусім ненармальнае, просім вас дапамагчы нам хутчэй вырашыць гэту справу.

Дадаем, што для паравога ацяпленьня можна скарыстаць адпрацаваную пару шаўковай фабрыкі.

РАБОЧЫЯ ГАРБАРНІ ІМЯ СТАЛІНА.

Менск Пленум акадэмічнага савету Бан

19 ліпеня адбылося пасяджэньне пленуму акадэмічнага савету Беларускай Акадэміі Навук, на якім заслухана справаздача аб рабоце акадэміі за першае паўгодзьдзе 1931 году і праведзены выбары новага складу прэзыдыуму. Прэзыдэнтам акадэміі выбран тав. **П. О. Горын,** віцэ-прэзыдэнтам—т.т. **В. К. Шчэрбакоў і Якуб Колас,** неадменным сакратаром—тав. **Панкевіч,** членамі прэзыдыуму—т.т. **Рыўлін, Ашароўіч, Платун, Пятровіч, праф. Вальфсон, Сэрбэнта і праф. Кроль.** Пастанова перадана ў СНК БССР для зацьвярджэньня.

Даклад С. Будзінскага*)

Ні адна газэта, якая сапраўды стаіць на варце інтарэсаў рабочае клясы ды працоўных мас вёскі фашысцкай Польшчы, ня існуе легальна. Органы кампартыі, не лістоўкі выдаюцца і распаўсюджваюцца нелегальна. За распаўсюджваньне камуністычных лістовак, якія заклікаюць да забастовак, да салідарнага падтрыманьня бастуючых рабочых рабочымі небастуючых прадпрыемстваў, палітычных дэманстрацый і выступленьняў, фашысцкія суды прыгаворваюць да шмат гадоў катаржнай турмы. Нават дзяцей і моладзь 16-17 год фашысцкія суды за распаўсюджваньне камуністычных або камсамольскіх выданьняў прысуджваюць да 4-6 год катаржнай турмы. У часе арышту і пры допыце гэту моладзь жорстка зьбіваюць, у турме трымаюць не ў такіх умовах, што пасьля сканчэньня тэрміну прыгавору гэта моладзь з турмаў выходзіць інвалідамі.

Вось вам жывы прыклад. Адзін наш таварыш быў рэдактарам легальнай газэты, якая выдавалася ў Кракаве. Гэту газэту на любой прычыне і бяз прычыны паліцыя закрывала або штрафавала. Але рабочая маса сваімі грашовымі ўзносамі падтрымлівала газэту, і газэта праз увесь час выходзіла. Тады агенты дэфэнзывы перад дзьвярыма пакою, у якім жыў наш таварыш, падкінулі пачку канфіскаваных камуністычных лістовак. На гэтай падставе нашага таварыша прыгаварылі да 10 год катаржнай турмы, а газэту закрылі. Вось вам твар буржуазнай свабоды друку. Гэты факт зьяўляецца тыповым, такія праследаваньні пралетарскай або лева-сялянскай прэсы маюць месца на ўсім абшары Польшчы. Асабліва лютуе фашысцкі тэрор супроць пралетарскага лева-сялянскага і нацыянальна-вызваленчага друку на акупаваных тэрыторыях Заходняй Беларусі і Зах. Украіны.

Ня думайце, таварышы, што ў фашысцкай Польшчы забаронен толькі камуністычны друк. Гэта памылка. Буржуазія забаранае кожную газэту, якая рашуча ставіць пытаньне аб барацьбе працоўных і эксплёатаваных мас за іх сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Сялянскія масы, пад кіраўніцтвам пралетарыяту, працуюць стварыць свой друк, які прапагандуе лёзунг «зямля — сялянству бяз выкупу», дзе яны пішуць, што гэту зямлю бядняцка-серадняцкія масы могуць здабыць толькі ў саюзе і пад кіраўніцтвам рабочае клясы, у барацьбе супроць буржуазіі і кулацтва. Даволі гэту фразу напісаць, або даволі напісаць такі артыкул, у якім паміж радкоў прасьвечваліць-б гэтыя лёзунгі, каб газэта канфіскавалася, а рэдактар адпраўляўся ў турму. Толькі на працягу аднаго 1927 г. лева-сялянская нацыянальна-вызваленчая газэта Зах. Беларусі семнаццаць разоў канфіскавалася. У сувязі з гэтым 17 чалавек рэдактароў былі прыгавораны да турмаў з зьняволеньня ад ½ года да 3 год. Колькасьць канфіскатаў і штрафаў ітаральна нельга палічыць. За гэты год газэта канфіскавалася ня менш 50 разоў і прыгаворвалася да штрафаў ня менш чым 100 раз. Нарэшце, фашысцкі ўрад і гэту газэту закрыў, забараніўшы другім прыняць у работу лева-сялянскім газэты, нават пры існаваньні фармальнага дазволу з боку фашысцкай улады на выданьне іх.

Вось вам малюнак свабоды друку пабуржуазнаму. Ясная справа, калі клясавы ворат настолькі баіцца нашага рэвалюцыйнага слова або рэвалюцыйнага слова лева-сялянскіх дзеячоў, якія ідуць у саюзе з рабочай клясай, мы можам пераканацца, якой вялізарнейшай сілай валодаюць друкаваныя словы ў руках пралетарыяту, якім кіруе камуністычная партыя.

* * *

У другой частцы свайго дакладу тав. БУДЗІНСКІ надрабязна сьпыняўся на задачах рабсельскораўскага руху, цэнтральнага і мясцовага друку, на задачах разгорнуцьня пралетарскай самакрытыкі.

Тав. Будзінскі канчае свой даклад упэўнасьцю ў тым, што перабудова рабселькораўскага руху, якая яшчэ больш вялікае армію рабселькораў да канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва і павышае іх удзел у гэтым будаўніцтве, у барацьбе за міжнародную пралетарскую рэвалюцыю, за абарону краіны Саветаў, гэта перабудова будзе фарсаваным тэмпам завершана пад непасрэдным кіраўніцтвам партарганізацый, што яна забясьпечыць далейшы рост рабселькораўскага руху і ўздым яго на вышэйшую ступень.

*) Канец. Пачатак на 2 стар.

РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ ПРАПРАЦОЎКУ

пастаноў Усебеларускага зьезду рабсельваенкораў

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

1. Лічыць неабходным забясьпечыць масавую прапрацоўку вынікаў і пастаноў другога ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў сярод шырокай масы рабочых, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства БССР, надаўшы гэтай прапрацоўцы характар адказна-палітычнай кампаніі.

Прапрацоўку пастаноў зьезду неабходна арганічна ўвязаць з яшчэ большай мабілізацыяй актыўнасьці мас на выкананьне асноўных гаспадарча-палітычных задач, у асаблівасьці падрыхтоўкі і правядзеньня ўборачнай кампаніі, ліквідацыі прарыву ў выкананьні прамфінпляну, у прыватнасьці па торфаздабычы і г.д.

Прапрацоўка вынікаў пастаноў зьезду павінна быць адзначана стварэньнем новых насьценных газэт, узмацненьнем існуючых, поўным выкананьнем развёрстукі на газэтнае аддзяленьне (Камвузу, саўпартшкопы, Палітасьветтэхнікуму і педагагічнага інстытуту), ператварэньнем брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькораўскага руху, завастрэньнем увагі да сыстэматычнай работы з рабселькорамі-адзіночкамі, выкананьнем насьценнымі газэтамі сваёй задачы, як калектыўнага рабкора цэнтральных і раённых газэт і г.д.

а) Даклады аб выніках зьезду заслухоць на агульна-гарадзкіх і раённых сходах партыйнага актыву, на адкрытых сходах партыйных і камсамольскіх ячэек, а таксама на сходах прафсыянальнага і камсамольскага актыву.

б) На спэцыялізаваных сходах рабселькораў разам з рабочымі і калгаснікамі (па групах вядучых прафсэкцый, па групах жывёлагадоўчых, па групах інтэнсіўных саўгасаў і калгасаў і г.д.) прапрацаваць пастановы адпаведных сэкцый зьезду. Забясьпечыць удзел у прапрацоўцы спэцыялістаў, гаспадарнікаў і прафработнікаў.

в) У часе кампаніі прапрацоўкі вынікаў зьезду неабходна арганізацыйна замацаваць умову з друкам і рабселькорамі УССР аб сацыялістычным спаборніцтве на поўнае і найбольш хуткае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16-га красавіка 1931 г., пастаноў усесаюзнай нарады пры «ПРАВДЕ» і другога ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

г) У лютым 1932 году разам з ЦКК КП(б)Б правесьці ўсебеларускі месячнік масавага агляду самаправеркі выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка, пастаноў ўсебеларускага зьезду рабселькораў і ўсесаюзнай нарады пры «ПРАВДЕ».

Кіраўніцтву Камвузу Імя Леніна, ўсебеларускай саўпартшкопы і палітасьветтэхнікуму ўдасканаліць тэрміны правядзеньня навучальнай праграмы газэтных аддзяленьняў, выходзячы з таго, што ў лютым 1932 г. студэнты газэтных аддзяленьняў будуць накіраваны на месяц у раёны БССР для дапамогі партарганізацыям у правядзеньні масавага агляду самаправеркі.

д) Прапрацаваць пастановы ўсебеларускага зьезду рабселькораў і ўсесаюзнай нарады пры «ПРАВДЕ» ва ўсіх зьвеньнях сыстэмы партыйнай і камсамольскай асьветы.

Культпропу ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ даць аб гэтым адпаведныя паказаньні.

2. На працягу бліжэйшых месяцаў заслухаць на пасяджэньні бюро і сакратарыяту ЦК КП(б)Б даклады некальких райкомаў і гаркомаў КП(б)Б аб выкананьні пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскага руху і нізавых газэт і ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва гэтым вучасткам работы.

3. Абавязаць БДВ пад адказнасьць т.т. Некрашэвіча і Брэйнэзіна ў дэкадны тэрмін выдаць масавым тыражом зборнік пастаноў усебеларускага зьезду рабселькораў.

4. Абавязаць рэдакцыі цэнтральных і раённых шматтыражак і насьценных газэт зьмяшчаць пастаянныя аддзелы па пытаньнях барацьбы за ажыцьцяўленьне пастаноў усебеларускага зьезду рабселькораў.

Пэрыядычна праводзіць апэрацыйна-масавую работу (рэйды, нарады і г. д.) па праверцы выкананьня пастаноў зьезду і ў асаблівасьці пастаноў тэй сэкцыі, якою ў часе зьезду кіравала адпаведная цэнтральная або раённая газэта.

Сакратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б ГЕЙ
Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.

Усім ГК і РК КП(б)Б

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б завастрае асаблівую ўвагу ўсёй КП(б)Б, усіх гарадзкіх і раённых камітэтаў КП(б)Б на неабходнасьці забясьпечыць сыстэматычнае, глыбокае замацаваньне і далейшае разгортваньне тэй работы па перабудове рабселькораўскага руху і нізавога друку, якая была праведзена ў часе падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Дабіцца рашучага перапому ў рабселькораўскім руху, ажыцьцявіць яго перабудову ў адпаведнасьці з пастановаю ЦК УсеКП(б) ад 16-га красавіка 1931 г. і ўзмацніць сыстэматычнае партыйнае кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам, як адным з важнейшых вучасткаў агульна-партыйнай работы—адна з першачарговых задач усёй КП(б)Б.

У прыватнасьці неабходна безадкладна выканаць паказаньне ЦК УсеКП(б) аб тым, што «для кіраўніцтва рабселькорамі і нізавым друкам пры парткамітэтах павінны быць створаны камісіі ў складзе загадчыка культпропаддзелам, рэдактара газэты, прадстаўніка РСІ, пракуратуры і інструктара па друку, а пры культпропах буйнейшых РК вылучаны інструктары друку».

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б ускладае на раённыя і гарадзкія камітэты КП(б)Б непасрэдную адказнасьць за арганізацыю масавай прапрацоўкі і кіраўніцтва практычным ажыцьцяўленьнем пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і прыняцьцем пастановы ЦК УсеКП(б) аб пастаўленьні гэтага дакументу пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Рэзалюцыя сходу Менскага партактыву ад 20 ліпеня 1931 г.

Заслухаўшы даклад тав. **БУДЗІНСКАГА** аб выніках другога Ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў, Менскі агульна-гарадзкі сход партактыву адзначае: што як работа, так і пастановы зьезду цалкам адпавядаюць ажыцьцяўленьню задач, пастаўленых ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове рабсельваенкораўскага руху.

Падкрэсьліваючы ўказаньне XVI зьезду партыі, што: «Гіганцкія посьпехі партыі ў справе будаўніцтва сацыялізму ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы сталі магчымы толькі на базе вялікай актыўнасьці рабочай клясы і ідучых за ёй працоўных мас, якія выказаліся ў шырокім разьвіцьці сярод рабочых сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, у перабудове работы ўсіх органаў, пралетарскай дыктатуры партыйных, прафсаюзных, савецкіх і каапэрацыйных арганізацый пад лёзунгам мабілізацыі мас за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі краіны, за перамогу цяжкасьцяй, за паварот прафсаюзу тварам да вытворчасьці і савету, да калгаснага будаўніцтва» (з рэзалюцыі XVI партзьезду па справаздачы ЦК УсеКП(б), актыў Менгарадзкой арганізацыі адзначае, што гэты вялікі ўздым актыўнасьці мас адбывае рабсельваенкораўскі рух, які перажыў і перажывае паласу бурнага ўздыму і актыўнасьці мас рабсельваенкораў, што знайшло адлюстраваньне ў работах другога Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Высокая палітычная актыўнасьць дэлегатаў зьезду, прасякнутая канкрэтным дзелавым зьместам, была забясьпечана дзякуючы па-бальшавіцку праведзенай партарганізацыямі пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б падрыхтоўчай работы да зьезду. Дзякуючы перабудове мэтадаў работы самога зьезду, якая ў асноўным праходзіла ў сэкцыях, што дало магчымасьць кожнаму дэлегату прыняць непасрэдны ўдзел у абгаварэньні і вырашэньні тых канкрэтных задач, якія стаяць перад тэй галіной народнай гаспадаркі, дзе даны рабселькор працуе.

Зьезд прапаў, як зьезд рэканструкцыянага перыяду, як зьезд перабудовы рабсельваенкораўскага руху, тварам да канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, пад адзнакай павышэньня ролі рабселькора, які над кіраўніцтвам партыі становіцца арганізатарам мас для справы сацыялістычнага будаўніцтва, у барацьбе за пяцігодку за чатыры гады.

Як падрыхтоўка да зьезду, якая дала вялізарны рост і канкрэтныя дасягненьні ў перабудове рабсельваенкораўскіх радоў і нізавога друку і ўзмацненьне партыйнага кіраўніцтва імі, так і сама работа зьезду, якая падагуліла дасягнутыя посьпехі і дала разгорнутую праграму замацаваньня іх і далейшай перабудовы для забясьпячэньня канкрэтнага ўдзелу рабсельваенкораў і друку ў фарсаваньні тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, для падняцьця рабсельваенкораўскага руху на яшчэ больш вышэйшую ступень, — усё гэта — яшчэ адзін моцны ўдар па правых і «левых» апартуністычных спробах адарваць рабсельваенкораўскі рух ад канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, па спробах супроцьставіць рабселькораўскі рух і друк партыйнаму кіраўніцтву, што знайшло ў свой час адбітак у выступленьні **С. Праўды** аб «двойственном» становішчы раённых газэт, рашуча асуджанага ўсёй партарганізацыяй і рабсельваенкорамі пад націскам чаго са значным спазьненьнем ад яе рашуча адмовіўся і сам аўтар.

Агульны сход Менскага гарадзкога партактыву ўхваляе пастанову сакратарыяту ГК КП(б)Б аб масавай паглыбленай прапрацоўцы вынікаў Усебелар

Год выданьня—XV
№ 197 (4102)
Чацьвер, 23 ліпеня 1931 г.
Цана нумара 5 кап.
ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,)—сакратар—10-74, партсэкстар—13-80, прамысл.—13-80, сац. заканн.—6-19, мясц. інформ.—6-19, замеж. інформ.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторы: выд—781, аддз. абвестак—7-81

Голад у Зах. Беларусі

Калёніяльная палітыка акупантаў давяла працоўныя масы да поўнага жабрацтва

У апошнія часы на старонках фашысцкага віленскага друку ў сувязі з высьвятленьнем відаў на ўраджай, усё больш часта зьяўляюцца весткі аб поўным неўраджаі ў сёлетнім годзе і пагрозе голаду ў Зах. Беларусі. Трэба адзначыць, што фактычна шырокія масы працоўных многіх паветаў Зах. Беларусі даўно галадаюць. Яшчэ ў чэрвені г. г. карэспандэнт манархічнага віленскага «Слова» пісаў: што **«насельніцтва Зах. Беларусі харчуецца хлебам, сьпечаным напалову з аірам, карою і інш. дадаткамі»**. Зараз і такога хлеба няма. Калёніяльная палітыка акупантаў, палітыка выцісканьня з працоўных апошніх сокаў на далейшыя ўзбраеньні і падрыхтоўку ўзброенага паходу на Савецкі Саюз, давяла працоўнае сялянства Зах. Беларусі **да поўнай руіны, да голаду.** Продаж-жа з аукцыёну сэквэстратарамі за няўзнос падаткаў хатніх рэчаў, выклікаў хвалю самагубстваў сярод сялян у Зах. Беларусі. У дадатак да ўсяго, што не ўдалося заграбіць фашысцкай уладзе, зараз зьнішчаецца рознымі стыхійнымі няшчасьцямі, як градам, паводкамі, ураганам і інш. Толькі на працягу вясны бягучага году над некаторымі паветамі Зах. Беларусі, **як Новагрудзкі, Сьвянцянскі, Баранавіцкі і Ашмянскі** тры разы пранесьліся градавыя буры, якія прычынілі вялізарныя страты. У чэрвені пасьля такой буры з градам «Кур'ер Віленскі» пісаў наступнае:

«Над Новагрудзкім ваяводзтвам пранеслася гвалтоўная навалніца з градам і адарваньнем хмуры. Гураганам нанесены вялізарныя страты. Пашкоджаны азімыя і яравыя пасевы. Паткі вады павыбівалі равы, а занесены пяском і мулам палі. Зьнесена шмат мастоў, а дарогі абярнуліся ў глыбокія равы і г. д.».

Вясковая і местачковая беднота, якая не апраўлялася яшчэ пасьля вясеньняй паводкі, зараз зноў панесла вялізарныя страты. З прычыны неўраджаю ў мінулым годзе і доўгай цяжкай зімы бягучага году шмат сялян прымушана было скарміць насеньне, таму вялізарныя абшары засталіся незасеянымі. Асабліва значна скарочана плошча пад бульбай—гэтага аднаго з асноўных харчу працоўных мас.

З прычыны цяжкай зімы, як ужо адзначалася на старонках савецкага друку, азімыя зьнішчаны напалову, а ва многіх мясцох і зусім. **Засуха-ж у чэрвені і ў ліпені бягучага году спаліла яравыя.** І вось **над краінай павісла здань голаду.** Наколькі пагражаючым зьяўляецца становішча, гэтага ня можа нават скрыць і фашысцкая прэса. У № 163 фашысцкага «Кур'ера Віленскага» ў карэспандэнцыі са Сьвенцянскага павету пішацца:

«Надзея на паляпшэньне стану азімых у Сьвянцянскім павеце поўнасьцю правалілася. Мала лепш стаіць справа і з яравымі. Прадбачанае зьнішэньне ўраджаю азімых на два квінталі з гэктару ніжэй сярэдняга трэба лічыць канчаткова пацьвердзіўшымся».

Але відаць ураджай настолькі загінуў, што газэта ня можа скрыць, і пасьля такой заўвагі піша далей:

«Дай, божа, каб хаця столькі ўдалося сабраць. Чаго ня зьнішчыла зіма, дык дакончыла надвор'е ў часе красавіньня жыта, якое адбывалася ў нас ў чэрвені, а там — маразы ў маі. Доўгая-ж засуха ў чэрвені і ліпені так ударыла па ярыне, што АЎСЫ ПАЖОЎКЛІ ЗАЎЧАСНА, ВЫКАЛАСАВАЛІСЯ. ПАЖОЎКЛІ ТАКСАМА БУЛЬБА, ГАРОХ, ЯЧМЕНЬ І ПЕРАСТАЛІ РАЗЬВІВАЦЦА. Калі дадаць да ўсяго гэтага град ў маі і чэрвені, ЯКІ ЗЬНІШЧЫЎ УСЕ ПАСЕВЫ Ў ПАЎДНЁВАЙ І ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЧАСТКАХ ПАВЕТУ, а таксама страшэнны ураган, які пранёсься над паветам 17-га ліпеня, прычым зьнішчэньні ад якога не падлічаны яшчэ і да гэтага часу,— ДЫК ПРЫХОДЗІЦЦА СКАЗАЦЬ, ШТО НАД ПАВЕТАМ ПАВІСЛА ЗДАНЬ ГОЛАДУ».

Газэта піша далей, што павет, які на працягу 5 год церпіць ад неўраджаю, зараз ня ў стане сваімі ўласнымі сіламі залатаць гэту дзіру (г. зн. справіцца з голадам). Апрача таго, газэта зазначае, што з прычыны адсутнасьці дапамогі пасьля паводкі ўвесну сёлетняга году засталося **незасеяным некалькі сот гэктараў. Увосень-жа плошча незасеяных азімых будзе яшчэ большая.**

Фашысцкая газэта, зразумела, яўна перапамяншае сапраўднае становішча працоўных мас нават у Сьвенцянскім павеце. Яна паведаміла толькі аб тым, чаго далей нельга ўтаіць. Здань голаду, якая паводле нават фашысцкай газэты навісла над Сьвенцянщчынай, у сапраўднасьці лучае **над усёй Заходняй Беларусьсю.** Фашысцкі ўрад, які заняты з галавою падрыхтоўкай новага паходу на Кіеў і Менск, ніякай дапамогі працоўным масам ня даў і ня дасьць. На адбудову зьнішчаных мастоў, на падрыхтоўку з Зах. Беларусі пляцдарму для будучай вайны, на дапамогу памешчыкам, кулакам і асаднікам фашысцкая ўлада сродкі знойдзе, і ім дапамагае. Працоўныя-ж масы, прадастаўлены свайму ўласнаму лёсу — выміраньню ад голаду. Працоўным масам змогуць дапамагчы толькі яны самі. Цясьней згуртавацца пад сьцягамі кампартыі і выступіць на рашучую барацьбу супроць акупантаў, за поўнае і канчатковае вызваленьне з-пад ярма фашысцкай дыктатуры

Не дапамагае і зацісканьне падатковай шрубы

ВАРШАВА, 22. Фашысцкая «Газэта Варшавска» ў № 217 паведамляе, што бюджэтны дэфіцыт у чэрвені г. г. дасягнуў **44 млн. злотых.** Бюджэтны дэфіцыт у чэрвені г. г. зьяўляецца рэкордным за апошнія пяць год. Так, даходы ў чэрвені 1927 г. складалі **198,8 млн. злотых,** а выдаткі — **180 млн злотых,** у 1928 г. за той-жа месяц **216,6 млн.** злотых і **206,2 млн.** злотых. у 1929 г. **232,6 млн.** злотых і **232,1 млн** злотых., у 1930 г. — **216,2 млн.** злотых і **215,6 млн.** злотых і ў 1931 г. — **175,8 млн.** злотых і **219,4 млн.** злотых

Дзяржаўныя даходы зьмяншаліся ня толькі ў адным чэрвені. На працягу ўсіх месяцаў першага кварталу г. г. даходы бязупынна падаюць і, як зазначае газэта, бюджэтны недабор за першы квартал г. г. склаў ня 77 млн., як пісала ўрадавая газэта «Польска», а **97 млн. злотых** 20 млн. злотых фашысцкая ўлада ў мэтах замазваньня перад працоўнымі вялізарнага недабору запрыходавала няправільна, бо гэта сума ўзята з ільготных крэдытаў у польскім банку і зараз запрыходавана, як даход.

Калі параўнаць даход за першы квартал г. г. з даходам за гэты-ж самы пэрыяд часу мінулых гадоў, дык зноў такі кідаецца ў вочы вялізарнае зьмяншэньне дзяржаўных даходаў. Так, у 1928 г. даходы за першы квартал складалі **683,1 млн. злотых,** выдаткі — **649,7 млн.** злотых., у 1929 г. адведна — **728,8 млн** злотых і **718 млн.** злотых, у 1930 г. — **683,3 млн.** злотых і **680,5 млн.** злотых і ў 1931 г. — **584,5 млн.** злотых і **681,3 млн.** злотых — або зьмяшчэньне даходаў **на 99 млн. злотых.**

Ня гледзячы на надзвычайна суровыя меры пры спагнаньні падаткаў экзэкутарамі, напрыклад, продаж за няўзнос падаткаў апошняга каня або каровы селяніна, а вельмі часта і апошніх хатніх рэчаў, дзяржаўныя даходы ўсё-ж падаюць. Затое **растуць выдаткі.** Ня гледзячы на катастрафічнае становішча фінансаў, выдаткі за першы квартал г. г. ня толькі ня зьменшыліся, але, у параўнаньні з мінулымі гадамі, **нават узрасьлі.** Так, выдаткі за першы квартал бягучага году **на 1 млн. перавышаюць выдаткі за тойжа пэрыяд часу мінулага году і на 36,1 млн. злотых выдаткі 1928 г.,** калі гаспадарчая канюнктура была значна лепшай.

На што, на якія мэты ідуць гэтыя сотні мільёнаў і мільярдаў — ня прыходзіцца многа гаварыць. Варта толькі адзначыць, што зараз, у момант вялізарнейшага гаспадарчага напружаньня, фашысцкі ўрад, каб зьвесьці канцы з канцамі, вымушан быў звольніць каля 70 тыс. дзяржаўных служачых, закрыць некалькі тысяч сярэдніх і пачатковых школ, скараціць пэнсіі інвалідам, удовам і сіротам, скараціць жабрачую дапамогу беспрацоўным, **але вайсковы бюджэт пакінут недатыкальным,** але выдаткі на ўтрыманьне паліцэйскага і дэфэнзыўнага апарату ня толькі ня зьменшаны, а наадварот, павышаны (пэнсія паліцыі павышана на 10 проц.), за «празьмерную працу» — па арышце і катаваньнях рэвалюцыйных рабочых і сялян. Якія-б «мірныя» арыі не сьпявалі польскія салаўі Залескія ў Жэневе, мову лічбаў ім не затушаваць і не ўтаіць. Фашысцкі ўрад Польшчы, ня гледзячы на катастрафічны стан сваіх фінансаў, павялічвае свае выдаткі нават паводле афіцыяльных даных на сотні мільёнаў злотых на працягу толькі аднаго кварталу. А гэта гаворыць за тое, што **польскі фашызм прысьпяшае тэмпы ўзбраеньняў, прысьпяшае і момант інтэрвэнцыі супроць СССР.**

Масавыя самагубствы беспрацоўных э голаду

ВАРШАВА, 21. Жудасная галеча сярод беспрацоўных за апошнія часы прыняла патрасаючы характар. Фашысцкі ўрад, які на **ваенныя ўзбраеньні, паліцыю і шпікоў аддае вялізарныя сумы грошай,** лёсам гэтых асуджаных на выміраньне з голаду і хвароб людзей, ня толькі ня цікавіцца, але наадварот, **пазбаўляе іх і тэй жабрацкай дапамогі, якую яны атрымлівалі дагэтуль.**

Сотні тысяч беспрацоўных з сем'ямі, такім чынам, кінуты на волю лёсу. Ёсьць шматлікія выпадкі, калі беспрацоўныя **харчаваліся сабачым мясам.** На падворках прыгожай Варшавы вельмі часта можна спаткаць зморaныя, стомленыя цені людзей, **якія са сьметнікаў дастаюць прагніўшыя рэшткі выкінутай ежы.**

Зусім ня дзіўна, што такое становішча выклікае **масавыя самагубствы беспрацоўных.**

Польскае хронікёрскае агенства падае прозьвішчы беспрацоўных, якія за адзін дзень — 20 ліпеня — скончылі жыцьцё самагубствам — 30-гадовая **Г. Стэмпальская** — работніца атруцілася воцатавай эсэнцыяй; 22-гадовы беспрацоўны **Г. Кайзер** атруціўся сьвяцільным газам; 22-гадовая работніца **В. Дылеўская** атруцілася ёдам: 27-гадовая **З. Вайцэхоўская** — работніца атруцілася аманіякам; 21-гадовы рабочы, беспрацоўны **М. Скатніцкі** напіўся сулімату; 60-гадовая **Ю. Міхалян** напіўся воцтвай эсэнцыі; 26-гадовы **Ян Кужыма** атруціўся медным купарвасам.

Катаржныя прысуды без канца

ВАРШАВА, 21. Як паведамляе сацыял-фашысцкі «Роботнік» ад 21 ліпеня ў акруговым судзе ў Пярэмышле закончыўся палітычны працэс, які працягваўся каля 3-х тыдняў. З лаўкі абвінавачаных адказвала звыш 18 асоб. **Увесь працэс быў пабудаван на паказаньнях шпікаў і дыфэнзывы.** У выніку судовай расправы з абвінавачаных асуджаны ад **паўтары да 4 год турмы,** 5 абвінавачаных да **10 месяцаў турмы кожны.**

ПАКРЫЦЬ БССР СЕТКАЙ ПАВЕТРАНЫХ ЛІНІЙ!

Пабудаваць у Менску абсталяваны аэрапорт

Увесь раённы друк павінен разгарнуць барацьбу за магутны паветраны флёт

Уся савецкая грамадзкасьць павінна ўключыцца ў дэкаду

Газэта «Рабочий» правяла вялікую работу па мабілізацыі мас вакол дэкадніка грамадзянскай авіяцыі, па шырокай папулярызацыі гэтай справы.

21 ліпеня рэдакцыя газэты «Рабочий» зноў склікала нараду па пытаньні дапамогі грамадзянскай авіяцыі, На нараду зьявіліся прадстаўнікі авія-брыгады, ЦСПСБ і работнікі газэт.

Гарком ЛКСМБ, гарсавет, гарпрафсавет, гарсавет Асавіяхіму не палічылі патрэбным прыслаць сваіх прадстаўнікоў Як відаць, яны мала турбуюцца аб пабудове ў Менску аэрадрому аб узмацненьні грамадзянскай авіяцыі.

Прадстаўнік ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ тав. ВАЙНШТЕЙН інфармаваў аб удзеле ЦСПСБ. 14 ліпеня пытаньне ставілася на прэзыдыуме ЦСПСБ. Пастанова прэзыдыуму была пушчана ў нізы толькі 17 ліпеня. У Бабруйск і Віцебск былі камандыраваны работнікі для дапамогі практычнаму правядзеньню кампаніі. Кампанія разгорнута слаба. Далёка ня ўсе ЦП саюзаў, райпрафсаветы ўключыліся ў дэкаду.

Амаль зусім не дапамагае правядзеньню дэкады шэф паветранага флёту — камсамол. Дзе энтузіясты, ініцыятары ўсякіх пачынаньняў — камсамольцы?

Асавіяхімаўская арганізацыя не мабілізавала на правядзеньне дэкады. Працуе толькі адзін апарат гарсавету Асавіяхіму.

Ваенком авіябрыгады тав. ГАМБУРГ прывёў факты, якія даказваюць, што гарком ЛКСМБ стаіць у баку ад дэкады і ні разу ня прыслаў сваіх прадстаўнікоў на нарады.

Невядома, што думае Менскі гарсавет? Ён павінен быў сказаць сваё рашаючае слова па пытаньні пабудовы аэрадрому, аддаць максімум увагі гэтай справе, аднак, ён ня прыслаў свайго прадстаўніка на нараду і наогул у кампанію ня ўключаецца. На прадпрыемствах зьбіраюцца сродкі, наладжваюцца суботнікі, аднак, уліку сабраных сродкаў няма, фонды не цэнтралізуюцца.

Нарада пастанавіла ў тэрміновым парадку вырашыць пытаньне аб месцы пабудовы новага аэрадрому грамадзянскай авіяцыі, адкрыць бягучы рахунак рэдакцыі газэты «Рабочий» для збору сродкаў.

Адначасова будзе праводзіцца збор сродкаў на эскадрыльлю «імя 8».

Нарада зьвярнулася ў прэзыдыум гарсавету з адкрытым лістом наконт дэкадніка і пабудовы аэрадрому.

Суботнік на „Дрэваапрацоўшчыку"

На менскім заводзе «Дрэваапрацоўшчык» 20 ліпеня на вечары згуртаваньня было пастаўлена пытаньне дапамогі грамадзянскай авіяцыі, Аднагалосна прынята рэзалюцыя аб правядзеньні аднаго суботніка.

Учора, 22 ліпеня, рабочыя ўсяго заводу выйшлі на суботнік. Усе заробленыя за гэты дзень грошы будуць перададны ў фонд грамадзянскай авіяцыі.

Гарбары зьбіраюць сродкі на пабудову самалётаў

Па ўсіх менскіх фабрыках, заводах і арцелях, якія ўваходзяць у саюз гарбароў, праведзены сходы, на якіх абмяркоўвалася пытаньне дапамогі грамадзянскай авіяцыі. Рабочыя, тэхнічны пэрсанал і служачыя гарбарнай прамысловасьці, упічаючы вялізарнае значэньне грамадзянскай авіяцыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, пастанавілі пабудаваць на свае сродкі САМАЛЁТ «ЧЫРВОНЫ АБУТНІК» разьмераў і тыпу самалёта, на якім загінулі 8 чырвоных камандзіраў. Ужо распачат збор сродкаў. Цэнтральнае праўленьне саюзу гарбароў гэтымі днямі ўжо адаслала 1.000 рублёў на пабудову самалёту на імя тав. Варашылава.

Рабочыя гарбарнай прамысловасьці мяркуюць сабраць каля 27 тысяч руб.

500 р.—у фонд авіяцыі

Рабочыя менскага хлебазаводу, жадаючы ўсямерна дапамагчы нашай грамадзянскай авіяцыі, якая адыгрывае вялізарнейшую ролю ў эканамічным разьвіцьці краіны, на нарадзе цэхавых камітэтаў заводу аднагалосна парашылі адлічыць 2% месячнага заработку на пабудову менскага аэрадрому, што складае каля 500 рублёў.

Спэктакль у карысьць авіяцыі

Сьледам за дзяржаўным цыркам тэатр расійскай оперы гэтымі днямі наладзіць адну пастаноўку на карысьць грамадзянскай авіяцыі. Усе сабраныя сродкі будуць перераданы ў фонд авіяцыі. Апрача таго, у адзін з дзён дэкадніка будзе арганізован скарбоначны збор па Менску.

Артысты оперы на працягу дэкадніка зробяць культмасавыя вылазкі на фабрыкі і заводы гор. Менску з мэтаю папулярызацыі ідэй разьвіцьця грамадзянскай авіяцыі.

Банкруцтва вялізарнага нямецкага канцэрну

БЭРЛІН. Пасьля раду спроб аздаравіць буйны тэкстыльны канцэрн у Нямеччыне **«Нордвольле»** фірма абвешчана **збанкрутаванай.** Узьнікла непасрэдная пагроза **звальненьня 25.000 рабочых і служачых** (да крызісу там працавала 50.000 чалавек) у сувязі з закрыцьцём усіх прадпрыемстваў тэкстыльнага канцэрну. Для таго, каб ацаніць значэньне гэтага банкрутства, даволі сказаць, што 17 раскіданых па ўсёй краіне прадпрыемстваў канцэрну **выпрацоўвюць штогодна 15 мільёнаў кілёграм воўны коштам у 170 млн. марак.** (ТАСС).

НЯБАЧАНЫ РОСТ САМАГУБСТВАЎ У НЯМЕЧЧЫНЕ

БЭРЛІН. Самагубствы ў Нямеччыне пачынаюць прымаць эпідэмічны характар. Так, у вёсцы **Опенштаце** каля Брэмену селянін, **маемасьць якога павінна была быць прадана з таргоў, падпаліў сваю хату. У агні апрача селяніна загінула 4 яго дзяцей.** У Кельні беспрацоўны—**бацька пяцерых дзяцей** кінуўся ў Рэйн, яго ўдалося выратаваць. У больніцы ён заявіў, што 10 дзён галадаў і далей такога жыцьця вытрымаць ня мог. У гэты-ж дзень у Рэйн кінуўся 15-гадовы рабочы падростак, **які ня мог сабе знайсьці работу і ўжо некалькі дзён галадаў.** (ТАСС).

АДЗІНЫ ВЫХАД — БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ КАПІТАЛУ ПАД СЬЦЯГАМІ НЯМЕЦКАЙ КАМПАРТЫІ

БЭРЛІН. Амаль на ўсіх заводах і фабрыках Нямеччыны прадпрыемцы ў сувязі з фінансавым крызісам стараюцца пратрымацца спосабам нявыплаты зарплаты і скарачэньня яе, а ў радзе выпадкаў і да прыпыненьня работ. Рабочыя заводу Бергман у Эрфурце ў адказ на нявыплату зарплаты абвясьцілі забастоўку. У Дзюсельдорфе адбылася канфэрэнцыя працоўных жанчын, у якой прымала ўдзел **100 дэлегатак. Сярод іх адна сацыял-дэмакратка, 21 камуністка, рэшта беспартыйныя.** Канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыю аб **неабходнасьці змагацца пад кіраўніцтвам кампартыі супроць голаду і наступленьня прадпрыемцаў.** (ТАСС).

ПАЗЫКА „З-ці РАШАЮЧЫ"

Ударнай дэкадзе—Ударныя тэмпы

Практыкаваць масавы абыход двароў аднаасобнікаў у мэтах правядзеньня шырокай растлумачальнай работы вакол пазыкі

У сваёй пастанове наконт правядзеньня ўдарнай дэкады рэалізацыі пазыкі на вёсцы прэзыдыум ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту і Белкалгасцэнтр прапанавалі ўсім сваім раённым арганізацыям выпучыць спэцыяльныя брыгады па рэалізацыі пазыкі на вёсцы, скарыстаўшы для гэтага раённы актыў, адпусьнікоў і выходных.

Па ўсіх раёнах павінны быць праведзены куставыя зьлёты сельскіх і калгасных камісій садзейнасьці сумесна з прафсаюзным, камсамольскім і савецкім актывам. Усім раённым камісіям садзейнасьці прапанавана на працягу дэкадніка правесьці ня менш 3 выязных пасяджэньняў у павсобных сельсаветах і калгасах.

УСЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ МАБІЛІЗУЕЦЦА НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ. КОЖНЫ КАМСАМОЛЕЦ ПАВІНЕН ЗАВЕРБАВАЦЬ НЯ МЕНШ 6 ПАДПІСЧЫКАЎ.

Гарадзкія шэфскія арганізацыі павінны дапамагчы падпісцы на вёсцы шляхам пасылкі ўдарных брыгад, рабочых адпускнікоў, пікэраў. КОЖНАЯ ФАБРЫКА, КОЖНЫ ЗАВОД АДКАЗВАЕ ЗА ПАСЬПЯХОВУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ Ў ПАДШЭФНЫМ РАЁНЕ І ВЁСЦЫ.

Ва ўсёй рабоце па правядзеньні дэкадніка трэба шырока ўжываць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж сельсаветамі, калгасамі, саўгасамі і МТС, арганізаваць грамадзкі буксір над адсталымі вучасткамі шляхам пасылкі паасобных брыгад і дэлегацый калгасаў, саўгасаў і МТС, якія з посьпехамі правялі падпіску.

Для рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў трэба практыкаваць мэтад масавага падворнага абходу. У часе ўборкі ўсю работу на вёсцы трэба праводзіць непасрэдна ў брыгадах, на полі.

Емяльянаўскі сельсавет паказвае ўзорны прыклад бальшавіцкай работы

Емяльянаўскі сельсавет, Смалявіцкага раёну, можа служыць прыкладам бальшавіцкай работы ў галіне рэалізацыі пазыкі.

Емяльянаўскі сельсавет калектывізован на 96 проц. З 576 гаспадарак у калгасах лічыцца 548.

На 20 ліпеня сельсавет выканаў поўнасьцю заданьне ў суме 14.775 руб. **Ня было ніводнага выпадку адмаўленьня ад падпіскі.**

Пры сельсавеце працуе камісія садзейнасьці з 5 чалавек і 12 грамадзкіх інструктароў. Існуюць камісіі пры кожным калгасе.

За час з 1 ліпеня па населеных пунктах праведзены 24 сходы па пытаньнях пазыкі; выпучаны брыгады з лепшых калгасьнікаў для падворнага абходу аднаасобных гаспадарак.

Емяльянаўскі сельсавет выклікаў на сацспаборніцтва і ўзяў на грамадзкі буксір Юр'еўскі сельсавет таго-ж раёну.

Лепшыя прыклады паказалі калгасы **«Змагар»**, які выканаў заданьне на 101,5 проц., і **«Чырвоны сьцяг»**, які падпісаўся на 1.385 руб. — 103 проц. месячнага даходу калгасьнікаў. Калгас вылучыў 4 брыгады, якія рэалізавалі сярод аднаасобнікаў аблігацый на 200 руб. наяўнымі грашыма.

Члены калгасу «Чырвоная крыніца» —т. т. **Шэрамэт і Сіліч**—70-гадовыя бабулі—падпісаліся на месячны даход, заявіўшы: **«няхай наша жмяня пораху трапіць у жывот буржую».**

Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту пры ЦВК БССР пастанавіла прэміяваць сумай у 100 руб. старшыню Емяльянаўскага сельсавету тав. **Скуратовіча** і адпусьціла 250 руб. на прэміяваньне лепшых камісій садзейнасьці і паасобных калгасьнікаў сельсавету.

Прыкладу Емяльянаўскага сельсавету павінны пасьледаваць усе сельсаветы Смалявіцкага раёну, які да 20 ліпеня выканаў заданьне толькі на 20,6 проц.

Г. К.

Ваяўнічыя бязбожнікі—актывісты рэалізацыі

Цэнтральны савет саюзу ваяўнічых бязбожнікаў СССР прыслаў за подпісам тавв. Яраслаўскага Савету бязбожнікаў БССР тэлеграму, у якой прапануецца тэрмінова ўключыцца ў дэкаду рэалізацыі пазыкі на вёсцы. Кожны бязбожнік павінен распаўсюдзіць аблігацый на вёсцы ня менш, чым на 25 руб. Ячэйкі саюзу ваяўнічых бязбожнікаў павінны арганізаваць брыгады па рэалізацыі пазыкі. Лепшыя актывісты будуць прэміяваны.

Сацспаборніцтва калгасаў Любаньшчыны

ЛЮБАНЬ. (Наш кар.). Калгасы Любаньскага раёну падпісаліся на пазыку на суму 22.640 руб., што складае 61 проц. заданьня. Наперадзе ідуць калгасы «Асьвета», «Чырвоная зорка», Камуна БВА, «Авангард», «Гэройі», імя 1 мая, «Сталёвы конь», «Дружба», «Чырвонае Палесьсе», «Будаўнік», «Ленінскі шлях», імя «1 мніўня» і «Чырвоны камунар».

У хвасьце цягнуцца калгасы «Чырвоны Усход», «Ударнік», «Чырвоная зьмена», «Пражэктар», «Перамога», «Бальшавік», «Зара камуны» і г. д.

Перадавікі рэалізацыі ўзялі на грамадзкі буксір адсталыя калгасы і вылучылі спэцыяльныя брыгады для правядзеньня масавай работы.

Случчына—у хвасьце рэалізацыі

СЛУЦАК. (Наш кар.). Слуцкі раён яўяў яшчэ патрэбных тэмпаў у рэалізацыі. Раённая камісія садзейнасьці бязьдзейнічае і ніякай работы сярод вёсавых камісій не праводзіць.

Райсалгасаюз стаіць у баку ад кампаніі і не дае ніякіх дырэктыў калгасам, як трэба праводзіць рэалізацыю, як улічыць сярэдні заработак, на якіх умовах папярэдзіць пазыку.

Інспэктар працы тав. Кабаноў быў накіраваны для правядзеньня гаспадарчых кампаній на вёску. Калі загадчык АПГадасы запытаў у яго, як ідзе падпіска па сельсавеце, дзе Кабаноў быў, дык апошні заявіў—«гэта не мая справа; твая пытайся—ты ж і рэалізуй». Гэта заява выдае апартуніста з галавою.

Наогул, па раёне рэалізавана пазыкі на 14 проц. заданьня

Неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на становішча з рэалізацыяй пазыкі на Случчыне. Свой.

***

ЧЫРВОНАЯ СЛАВАДА. (Наш кар.). Семежаўскі сельсавет нічога не зрабіў, каб прасунуць пазыку на вёску. Атрымаўшы заданьне ў 13.000 руб., ён рэалізаваў аблігацый на 2.830 руб., пераважна сярод рабочых і служачых, і на гэтым спыніў сваю работу.

«Пачакаем лепшых умоў» — сказаў нам. старшыні сельсавету. Ганебна цягнецца ў хвасьце і Чырвона-Слабодзкі сельсавет, які зусім нічога не зрабіў, каб рэалізаваць пазыку сярод сялянскага насельніцтва. Прафарганізацыі раёну не павярнуліся тварам да пазыкі.

Перадавыя сельсаветы суседніх — Старобінскага і Спуцкага — раённу павінны ўзяць сельсаветы Чырвона-Слабодзкага раёну на грамадзкі буксір.

Паведамленьні

— Сьпіс прадпрыемстваў, якія павінны вылучыць брыгады па 3-5 асоб для правядзеньня ўзаемнай праверкі становішча абаронай працы за час дэкадніка-агляду з 25/VII па 5/VIII, згодна дырэктывы Менгарпрафсавету. Прадпрыемствы і ўстановы, якія не ўвайшлі ў гэты сьпіс, павінны вылучыць самаправерваньня брыгады, адказнасьць за вылучэньне брыгад, іх працу і падвядзеньне вынікаў ускладаецца пэрсанальна на старшынь ФЗМК: зав. імя Варашылава —зав. «Камунар», «Вальшавік» — абутковая ф-ка, ф-ка «Кастрычнік» — ф-ка імя Крупская, ф-ка імя 8 сакавіка—ф-ка імя 1 мая, Эльвод — шорная ф-ка, сл. эксплёат. — сл. цягі, фармзавод—аддз. ВЭА, сл. шляху—«Полымя Рэвалюцыі», шчаціннная ф-ка — шчотачная, зав. «ДА» — ф-ка «Беларуская», Хлебазавод — «Чырв. Хэмік», Сьпіртзавод — зав. «Беларусь», 1-я сав. б-ца — 2-я сав. б-ца, НКФ — Белдзяржбанк, Гарадпчадкаса — Гарфа, чыг. б-ца — 3-я сав. б-ца, Дзяржпляж — ВСНГБ, Цагельні № № 1 і 3—цагельні №№ 2, 4, 5 і 6, Цагельня ВДВ № 3 — цагельня № 8, Ц. база Менбуду — Белбудаб'яд., Ц. дзіц. дысп. — крыгр. дз. № 1, Менкантора сувязі — Нек. кір. сувязі, БКС — МЦРК, Друк. імя Сталіна — друкарня «Зьвязда» і Камунаву, Талеф. станцыя — Перабуд. гал. сеткі, Гуга «Пралетары» — зав. «Ударнік», ЦПП — ЗК Менбуду, Менхлабудоўня — ГК Мукамольн. і хлебапек. прамысл., ф-ка «Камунарка» — міліцыя, Беддартранс — Белторфаб'яд., ЦСПОВ —Беларадыёэнтр., Гарсавет—зав. «Пралетары», Наркамсаб — Лесбел. Па ўсіх пытаньнях, якія датычацца агляду, дадзеткі можна атрымаць у Культмасавым сэктары Гарпрафсавету.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б І МЕНГАРПРАФСАВЕТ склікаюць 25 ЛІПЕНЯ г. г. у 6 гадзін вечара, у памяшканьні летняга тэатру саду «ПРАФІНТЭРН», ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ.

Парадак дня:

1. Вынікі выкананьня прамфінпляну 2-га паўгодзьдзя і задачы выкананьня прамфінпляну 2-га паўгодзьдзя на 1-е паўгодзьдзе і задачы выканаўцаў (дакладчык тав. ГРЫСЕВІЧ).
2. Аб перабудове спажыўкаапэрацыі і задачах рабочага забесьпячэньня (дакладчык—тав. ХАСКІН).

Модус прадстаўніцтва на канфэрэнцыю: 1 дэлегат ад 5 рабочых-ударнікаў.

Прапануецца сакратарам парткалектыву і ячэек КП(б)Б і фракцыям ФЗМК зараз-жа разгарнуць падрыхтоўчую работу да канфэрэнцыі і выбраць адпаведную колькасьць дэлегатаў.

Мандаты на канфэрэнцыю атрымаць у Гаркоме КП(б)Б (пакой № 16) з 22 па 25 ліпеня з 9-ці гадз. раніцы да 4-х гадз. дня.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б, МЕНГАРПРАФСАВЕТ.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Першая гукавая мастацкая карціна **Пуцёўка ў жыцьцё** Драма ў 34 эпізодах
Інтэрнацыянал Пач. у 7 г. веч. — **КНЯЖНА МЭРЫ** З выш прагр.—кіно-нарыс БДК **Ударны рэйд**
„Пралетары" Рэдар. з 12 г. дня. — На дзённых сэансах На вечэрніх — **„Заўжды ў пуці" Жонка доктара Брыяна**
„СПАРТАК" Пач. у 7, 9, и 11, Каса—з 6 гадз. — Замежны фільм **ЧАЛАВЕК, ЯКІ СЬМЯЕЦЦА** ў 10 частках

СПЕРМОКРЫН — ГИЗ — ПРОДАЖ ВА ЎСІХ АПТЭКАХ І МАГАЗЫНАХ ОАН. І ГІГІЕНЫ — ДЗЯРЖ. ІНСТЫТУТ ЭКСПЭРЫМЭНТАЛЬНАЙ ЭНДАКРЫНАЛЁГІІ НАРКА МАХОВЫ ЗДАРОЎЯ Даведкі і паказаньні да ўжываньня высылаюцца па першым зваротабавальнай дармова. Цана 1 фляк. 30 гр.—1 р. 50 к. „ 1 фляк. 50 гр.—2 р. 99 к. „ 1 кар. у аптуц.—1 р. 50 к. „ табл. 1 фл. 25 шт.—1 р. 25 к. — Прыі адсутнасьці ў магазынах, у аптэках, заказы і задаткі накіроўваюцца—„Москва, Москворецкая, 26, Гуп.

Менскі транспартна-эканамічны тэхнікум абвяшчае асеньні прыём студэнтаў на 1-шы курс. Мэтавая ўстаноўка тэхнікуму—падрыхтаваць тэхнікаў-эканамістаў на аўта-гужавой і транспартна-экспэдыцыйнай справе для Саюзтрансу. Прыём заяў з дакумантамі праводзіцца да 5 жніўня. Правілы прыёму абвешчаны ў даведніку НКА. Заняткі пачынаюцца 1 верасьня. 55 проц. прыязных забясьпечваюцца стыпэндыямі і інтэрнатам. Адрас: от. Менск таварная, транспартна-эканамічны тэхнікум.

ЧАЧЭРСКІ сельска-гаспадарчы тэхнікум сьвінагадоўлі абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР на 1-шы курс тэхнікуму. Заявы падаюцца па адрасе: м. Чачэрск (Гомельшчына, Сьвінагадоўчаму тэхнікуму) да 10 верасьня. Да заявы прыкладаюцца ўсе дакументы, згодна даведніка НКА за 1930-31 г. З 10 па 15 верасьня праводзяцца іспыты асобам, якія ня могуць паступіць у тэхнікум бяз іспытаў. Студэнты, якія свячасова ня зьявяцца на заняткі, а таксама арганізацыі, якія іх затрымваюць, будуць прыцягнуты да партыйнай, камсамольскай і адміністрацыйнай адказнасьці. Дырэктар тэхнікуму Суконьнікаў.

РАГАЧОЎСКАЯ КЛАПШКОЛА абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР вучняў у школу кваліфікацыйнага вучнёўства на аддз. абмену і разьмеркаваньня. Прыём праводзіцца на базе 5-годкі ва ўзросьце ад 16 да 18 год. Заявы прымаюцца да 20 жніўня ў канцылярыі школы па адрасе: г. Рагачоў, Цымерманаўская вул., Кваліпшкола. У першую чаргу прымаюцца дзе